незалежная газета

№ 11 (657) 17 сакавіка 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

## Генпракурор Васілевіч запярэчыў КДБ

Старонка 9



## Гісторыя Беларусі: афіцыйная ідэалогія ВКЛ

Старонка 12



## Лявон Вольскі заспявае на вершы Купалы

Старонка 11

# Шчаслівай, як Куба

зробіць Беларусь нафта Чавеса.

Венесуэла будзе пастаўляць у Беларусь 80 тысяч барэляў нафты ў дзень. Пра гэта паведаміў прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес у часе візіту Аляксандра Лукашэнкі за акіян. Не для ўнутрыбеларускіх патрэб, якія забяспечваюцца бязмытнай нафтай з Расіі. Пасля перапрацоўкі нафту плануецца прадаваць у Еўропе. Пастаўкі маюць распачацца ў маі.

Аб'ёмы ўражваюць: амаль 4,2 мільёна тон нафты за год. Уласныя патрэбы Беларусі складаюць каля 6 млн тон, а ўласнабеларуская здабыча склала ў 2009 годзе ўсяго 1,7 млн т. Дагэтулешнія абсягі экспарту з Расеі перавышалі 21 млн т за год. Цяпер іх удасца знізіць. Калі дзіўнаваты гешэфт удасца, гэта будзе самым значным за часы незалежнасці крокам па зніжэнні энэргазалежнасці Беларусі ад Расіі.

Падрыхтоўкай пагадненняў займаліся першы віцэ-прэм'ер урада Уладзімір Сямашка і спецыяльны пасланнік па адносінах з Венесуэлай Віктар Шэйман.

**Працяг на старонцы 2.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У аўторак на офісах інтэрнэт-выдання «Хартыя-97», газеты «Народная воля», у кватэрах журналістаў Наталлі Радзінай і Марыны Коктыш, палітыка Андрэя Саннікава прайшліператрусы. Старонка 4.**

# Першы за тэрарызм

Упершыню ў найноўшай гісторыі Беларусі да суда дайшла справа за падрыхтоўку тэрарыстычнага акта супраць дзяржаўных чыноўнікаў.



10 сакавіка ў Вярхоўным судзе пачаўся працэс ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, яго паплечніка Уладзіміра Асіпенкі, міліцыянта Міхаіла Казлова і шафёра Аляксандра Ларына.

У судовай клетцы сядзелі ўсе чацвёра абвінавачаных. Аўтуховіч, Асіпенка і Казлоў побач, а Ларын — на прыстойнай адлегласці ад іх. Да пачатку працэсу фатографам дазвалялі здымаць абвінавачаных. Потым Ларын заявіў, што выступае супраць відэа- і фотаздымак. Таму суддзя Аляксей Цяцюхін быў вымушаны іх забараніць.

**Працяг на старонцы 8.**

Частку пенсій і стыпендый вырашана выдаваць фішкамі з казіно. **Старонка 7.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Хто адважыцца кінуць выклік Лукашэнку?

Пяць плюсаў і пяць мінусаў Андрэя Саннікава.

Каардынатар «Хартыі-97» Андрэй Саннікаў стаў другім апазіцыянерам пасля Алеся Міхалевіча, які заявіў пра свой удзел у прэзідэнцкіх выбарах. Што можа прывабіць выбарцаў у гэтым кандыдаце? І, наадварот, адштурхнуць? Аналіз «НН».

**Працяг на старонцы 3.**



**Андрэй Саннікаў**

Нар. у Мінску ў 1954. Скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. У 1982—1985 працаваў у Сакратарыяце ААН у Нью-Ёрку. Пасля сканчэння Маскоўскай дыпламатычнай акадэміі ў 1989 — у Міністэрстве замежных справаў Беларусі. Ад 1993 да 1995 быў дарадцам місіі Беларусі ў Жэневе. У 1995 прызначаны намеснікам міністра замежных справаў Беларусі. З лістапада 1996 стаў міжнародным каардынатарам грамадскай ініцыятывы «Хартыя-97». Мае дыпламатычны ранг пасла. Жанаты, мае сына.

# Венесуэла зробіць Беларусь шчаслівай, як Кубу

Працяг са старонкі 1.

Супольнае беларуска-венесуэльскае прадпрыемства «Петралера БелаВенесуэлана» здабывае каля 1 млн т нафты ў год. Плануецца павялічваць здабычу.

Узамен беларусы будуць весці газіфікацыю венесуэльскіх гарадоў і пасёлкаў. «За год мы пабудуем у Венесуэле 3—4 заводы па вытворчасці трактароў, аўтамабіляў, вялікагрузных аўтамабіляў, буйны цагельны завод, разлічаны на выпуск 100 тыс. тонаў умоўнай цэглы», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Цана будучай нафты пакуль не агалошваецца.

Венесуэла пастаўляе нафту па льготных цэнах на Кубу, у Нікарагуа, драбнейшым саюзнікам і нават асобным «братэрскім» гарадкам у Штатах. Пастаўкі маюць палітычную подбіўку. Чавэс фінансуе краіны, якія падтрымліваюць яго ў барацьбе за ўплыў на сусветнай арэне, пераважна супраць ЗША. Аднак сама Венесуэла знаходзіцца ў сумным эканамічным становішчы. Сёлета краіна пакутавала ад дэфіцыту электраэнэргіі. Відавочна, што пастаўкі нафты за свет, у далёкую Еўропу, будуць залежаць ад палітычнага лёсу Чавэса.

Дагэтуль найбліжэйшым і найбольшым рынкам для нафты з берагоў Арынока былі ЗША.

**Сяргей Гезгала**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Дыктоўка ў Гродне

**21 сакавіка ў Гродне** пройдзе III агульнанацыянальная дыктоўка. Тэкст дыктоўкі — прадмова Уладзіміра Караткевіча да кнігі «Памяць зямлі беларускай». Чытаць тэкст будзе паэт і перакладчык, кіраўнік Беларускага ПЭН-цэнтра Андрэй Хадановіч. Пасля дыктоўкі адбудзецца шоу-свята мовы ад Андрэя Хадановіча. Усе ўдзельнікі атрымаюць памятныя падарункі. Па заканчэнні імпрэзы ўсіх чакае святочны торт.

Мерапрыемства пройдзе **ў 12.00 на вуліцы Будзённага, 48а-100 (зала ва ўнутраным дворыку)**.

# «Упиралась ногами в тротуарную плитку»

Фотакора «НН» Юлію Дарашкевіч 24 сакавіка судзяць за збіццё міліцыянта і непадпарадкаванне.

15 сакавіка да бацькоў мужа фотакора «НН» Юліі Дарашкевіч раптоўна прыйшлі міліцыянты. І паведамілі, што 24 сакавіка мае адбыцца суд па яе справе. Увечары таго ж дня асобы ў штацкім ужо ламіліся ў дзверы кватэры, дзе жыве Юлія. Яе муж не адамкнуў. Пасля паўгадзіннай аблогі яны рэціраваліся, калі фотажурналістка паабяцала інспектару Саладуну, што заўтра з'явіцца да яго.

16 сакавіка Юлію Дарашкевіч у РУУС Цэнтральнага раёна азнаёмілі з двума адміністрацыйнымі пратаколамі. Згодна з першым, журналістку абвінавачваюць у непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі пры спробе адвесці яе ў службовы аўтобус для таго, каб даставіць у РУУС Цэнтральнага раёну (арт. 23.4 КаА РБ). «Упиралась ногами в тротуарную плитку, пыталась вырваться», — гаворыцца ў пратаколе.

Паводле другога пратакола, Юлію вінавацяць у наўмысным нанясенні лёгкіх цялесных пашкоджанняў супрацоўніку міліцыі. Згодна судмедэкспертызы, пашкоджанні не прывялі да расстройства здароўя міліцыянта Восіпава В.В., якога нібыта ўдарыла журналістка.

Справа тычыцца падзеяў 16 лютага. Юлію Дарашкевіч затрымалі, калі яна здымала акцыю салідарнасці з палітвязнямі на Кастрычніцкай плошчы. Тады прапаршчык Ігнацьеў забраў у яе журналісцкае пасведчанне, а іншы чалавек у цывільным (не прадставіўся) адвёў яе ў аўтобус, зазначыўшы, што журналістка нібыта ўдарыла яго. У той вечар фотакарэспандэнтку адпусцілі без складання пратакола. Цяпер справа ўсплыла.

За непадпарадкаванне Юліі пагражае да 50 базавых велічыняў, за нанясенне цялесных пашкоджанняў — штраф або адміністрацыйны арышт.



Вось гэтага міліцыянта з тонкімі рысамі твару нібыта збіла Юлія Дарашкевіч.



А гэта іншы кадр з Плошчы: асобы ў штацкім душаць Сяргея Грыца, фатографа Associated Press.

Працэс адбудзецца 24 сакавіка ў 10.00 у судзе Цэнтральнага раёна (Кірава, 21), каб.304.

Цікава, што 16 сакавіка адбыліся налёты асобаў у цывільным на рэдакцыі незалежнай газеты «Народная Воля» і сайту «Хартыя'97». Нагадвае акцыю запалохванне прэсы напярэдадні Дня Волі.

**Сямён Печанко, Сяргей Гезгала**

Рэдакцыя запрашае ўсіх прыхільнікаў таленту смелага фатографа падтрымаць яе ў судзе.

## СЦІСЛА

### «Палоніцы» пакінулі штраф

Вышэйшы гаспадарчы суд пакінуў у сіле рашэнне Гродзенскага абласнога, які аштрафаваў ТАА «Палоніка». Таварыства ўзначальвае лідэр Саюза палякаў Беларусі Анжаліка Борыс. «Палоніку» аштрафавалі за правядзенне культурных мерапрыемстваў без дазволу на 3,5 млн рублёў з канфіскацыяй больш як 40,4 млн рублёў, атрыманых у выніку гаспадарчай дзейнасці.

### У цягніку знайшлі паўтары кілі какаіну

Наркотык, запакаваны ў два поліэтыленавыя пакеты, ляжаў у тайніку, у пустым купэ прычапнога вагона з Базеля. Яго выявілі памежнікі на вакзале ў Брэсце. Два праваднікі, грамадзяне Расіі, затрыманыя. Пры затрыманні яны спрабавалі даць хабар.

### Пры канцы тыдня пацяплее да +8°С

У суботу і нядзелю ў Мінску слупок тэрмометра ўздымецца да 6—8°С градусаў цяпла. У Брэсце +10°С. Найхаладней у Віцебску: +2—4°С. Праўда, у пачатку наступнага тыдня зноў пачне халадаць. На Дзень Волі, 25 Сакавіка, папярэдне прагназуецца адзін градус марозу.

### Катэдра адзначае 300-годдзе

16 сакавіка архікатэдральны касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску адзначыў юбілей. Касцёл быў заснаваны езуітамі ў 1700 г. Яго кансекраваў віленскі біскуп Канстанцін Бжастоўскі ў 1710 г.

**СМ**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў. З 1 красавіка яна вырасце да 7500 рублёў у сувязі з ростам рознічнай цаны.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перменаказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй

**падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю**

**В.Г., Т.П., Надзеі С., Алегу Т., Ю.Дз., В.Г., Людміле Л., Кірылу М., Мікіту З., Алесю Л., Т.П., А.К., У.Ц., Генадзю Ш., В.Г., Таццяне К., Аляксандру Л., Альберту С., С.Б., Г.Ч., М.С., Пятру Т., І.Ф., Інэсе Б., Ігару М., В.Л., Канстанціну М., Міхаілу Ж., Юрыю Л., П.Р., Яўгену Ч., Ірыне М., Аляксандру К., Аляксандру В., Сяргею М.** з Мінска.

# Галасы будуць лічыць тыя самыя

На гэтым тыдні будуць канчаткова сфармаваныя ўчастковыя выбарчыя камісіі на мясцовыя выбары. Людзі, што туды трапяць, непасрэдна будуць займацца падлікам галасоў. «Няважна, як галасуюць. Важна, як лічаць», — гаворыць стары сталінскі прынцып.

Сярод партый больш за ўсё прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій вылучыла праўладная Камуністычная партыя Беларусі — 516 чалавек. Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя вылучыла 434 чалавекі, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці — 358, Аб'ядная грамадзянская партыя — 281, Беларуская партыя левых «Справядлівы Свет» — 160, Беларуская аграрная партыя — 132, Партыя БНФ — 122, Ліберальна-дэмакратычная партыя — 95, Рэспубліканская партыя — 73, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя — 24, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада — 9, Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ — 8. Незарэгістраваная БХД вылучыла 160 чалавек.

У выніку з амаль 800 вылучэнцаў апазіцыйных партый у склад камісій трапіла блізу 85 чалавек, 11% ад заяўленай колькасці. Што дазваляе апазіцыі зноў гаварыць пра парушэнні выбарчага заканадаўства.

Ад «Справядлівага свету» трапіў 31 чалавек, АГП — 23, Партыя БНФ — 17, БХД — 7, БСДП — 5, КХП-БНФ, БСДГ — 0. Яшчэ не выключана, што гэтая лічба крыху ўзрасце, але не істотна.

А хто ж тады будзе лічыць галасы? З грамадскіх аб'яднанняў у склад участковых камісій 3440 прадстаўнікоў вылучыла «Белая Русь», 4101 — БРСМ, 3787 — Беларускі саюз жанчын, 2247 — Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, 9370 — Федэрацыя прафсаюзаў.

На гэтым жа тыдні пачнецца рэгістрацыя кандыдатаў і агітацыя. Мясцовыя выбары пройдуць 25 красавіка.

**ЗП**

**Колькі вылучана ў камісіі і колькі трапіла**

| | Вылучана | Трапілі |
|---|---|---|
| *«Чэсныя» партыі* | | |
| Камуністычная партыя Беларусі | 516 | 427 |
| Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя | 434 | 432 |
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці | 358 | 342 |
| *«Нячэсныя» партыі* | | |
| Аб'ядная грамадзянская партыя | 281 | 23 |
| Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя | 160 | 7 |
| Партыя БНФ | 122 | 17 |

# Аляксей Валабуеў: Мы абышлі кожны пад'езд, кожную кватэру

15 сакавіка скончыўся этап збору подпісаў кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых саветаў. Цяпер іх на сапраўднасць правяраюць выбарчыя камісіі. Салігорскі «маладафронтавец» Аляксей Валабуеў расказвае пра першы этап выбарчай кампаніі.

**«Наша Ніва»: Як ацэніш этап збору подпісаў на сваёй акрузе?**

**Аляксей Валабуеў:** У прынцыпе, пазітыўна. Агулам мая каманда назбірала 507 подпісаў з 2800 жыхароў акругі. За мяне падпісаўся кожны пяты. Падчас збору мы зайшлі абсалютна ў кожны дом, пад'езд, пазванілі ў кожную кватэру. Але дзесьці не было гаспадароў. У ідэале мы павінны былі вярнуцца туды зноў, але на гэта ўжо не хапіла часу. Калі зарэгіструюць кандыдатам, зноў давядзецца абысці кожную кватэру.

**«НН»: А адмоваў шмат было?**

**АВ:** Зусім няшмат. Мы пачалі збіраць подпісы ў першы ж дзень. Таму для людзей мы былі такімі свежанькімі, новымі, цікавымі. Яны вельмі пазітыўна да нас ставіліся. Асноўная частка маёй каманды — беларускамоўныя людзі. Людзі ўспрымалі тое, як належнае. Можа, спачатку і думалі, што прыйшоў нейкі беспрацоўны партыец, але потым, калі глядзелі, што малады інжынер, дык з радасцю падтрымлівалі. Бабулькі ўжо загадзя рыхтавалі пашпарты.

**«НН»: А негатыў нейкі быў?**

**АВ:** Ды не сказаў бы. Ужо ў самым канцы збору подпісаў па некаторых дамах раней за нас прайшлі нашы канкурэнты. Таму людзі з гэтых дамоў крыху напружваліся. Казалі, што да іх ужо прыходзілі збіраць подпісы. Але гэта не таму, што менавіта мы ім не падабаемся.

**«НН»: А ведаеш сваіх канкурэнтаў па акрузе?**

**АВ:** У выканкаме нам такую інфармацыю не далі, але не вельмі і хацелася. У мінулы раз па гэтай акрузе ішла цяперашняя старшыня райсавета спн.Клішэвіч. Маглі б выбраць і больш лёгкую акругу, але нам няма асаблівай розніцы, каго перамагаць.

**«НН»: То бок верыш у перамогу?**

**АВ:** Ну што такое верыш? Я ведаю, што ўжо перамог падчас збору подпісаў. Бачу, што большасць аддасць за мяне свае галасы. Пытанне толькі, наколькі справядліва іх будуць лічыць і ці зарэгіструюць мяне.

**«НН»: А чаму ў Салігорску і раёне гэтым разам на выбары ідзе так мала апазіцыі?**

**АВ:** У нас апазіцыя досыць сталага веку. Яна прайшла праз шмат падобных кампаній. Напэўна, некаторыя проста стаміліся. У нас маладая каманда. Мы разлічваем на перспектыву. Каб у выпадку чаго ўвайсці ва ўладу.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



**Аляксей Валабуеў**
нар. у 1981 у пасёлку Рось Ваўкавыскага раёна. Інжынер–будаўнік, грамадскі актывіст, праваабаронца. У 2003 скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «інжынер–будаўнік». У жніўні 2003 года размеркаваны ў Салігорск у будаўнічую арганізацыю «Белсантэхмантаж–2», дзе і працуе інжынерам.

# Пяць плюсаў і пяць мінусаў Андрэя Саннікава

Працяг са старонкі 1.

## 1. Рашучасць

**+** Андрэй Саннікаў не збіраецца ўдзельнічаць у выбарах проста дзеля птушачкі. На карту пастаўлена зашмат. Ніякай лаяльнасці ці абыякавага стаўлення ад уладаў Саннікаў чакаць не можа — будуць біць. Пачалі біць ужо цяпер. Нядаўна палітыка і яго жонку, вядомую журналістку Ірыну Халіп, дапытвалі па справе аб паклёпе на былога начальніка Упраўлення КДБ па Гомельскай вобласці Івана Каржа.

**–** Калі ёсць у Беларусі радыкальная апазіцыя, дык гэта якраз атачэнне «Хартыі-97». Палітык увесь час цвёрда выступаў за працяг эканамічных і палітычных санкцый супраць беларускага кіраўніцтва, пакуль у краіне не ўсталююцца дэмакратычныя свабоды. З аднаго боку, пазіцыя Саннікава ясная для выбарца. З іншага — празмерная радыкальнасць можа некага адштурхнуць.

## 2. Людзі

**+** «Еўрапейская Беларусь». За Саннікавым стаіць актыўная і рашучая моладзь. «Гэта адзіны кандыдат, які будзе працаваць на перамогу», — кажуць хлопцы з «Еўрапейскай Беларусі». Частка з іх прайшла праз школу ўжо легендарнага «Зубра». «Еўрапейская Беларусь» першая на ўсіх вулічных акцыях апазіцыі. На іх раўняюцца іншыя. Такія людзі і робяць выбарчыя кампаніі.

**–** Адсутнасць якой-небудзь палітычнай структуры. Казулін перад тым, як пайсці на выбары ў 2006 годзе, узначаліў Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю. У Саннікава партыі ці іншай арганізацыі няма. Праўда, за ім стаіць старэйшае пакаленне сяброў Партыі БНФ на чале з Баршчэўскім, Вячоркам, Івашкевічам, ды першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч.

## 3. Інтэрнэт

**+** Раскручаная інтэрнэт-старонка. Саннікава будзе падтрымліваць адзін з найбольш папулярных інтэрнэт-рэсурсаў — charter97.org. Сайт «Хартыі-97» мае 32 тысячы сталых наведнікаў. А перад выбарамі гэтая колькасць яшчэ вырасце на хвалі росту палітычнай актыўнасці.

**–** Нават у апазіцыйных асяродках «Хартыя-97» мае не самую лепшую рэпутацыю. Часта можна пачуць, што гэты партал называюць за падачу матэрыялаў «БТ наадварот», а таксама крытыкуюць за цэнзуру чытацкіх выказванняў у каментарах. На «Хартыі» ж кажуць, што гэта дысцыпліна.

## 4. Кар'ера

**+** Дыпламатычная кар'ера. Андрэй Саннікаў прайшоў выдатную дыпламатычную школу. Яшчэ за савецкім часам працаваў у беларускім прадстаўніцтве ААН у Нью-Ёрку. Быў дарадцам місіі ў Жэневе. У 1995 годзе Андрэй Саннікаў быў прызначаны намеснікам міністра замежных справаў. Сам палітык кажа, што яму не сорамна згадваць пра той час, бо ўсё, што ён рабіў, рабілася дзеля ўмацавання беларускага суверэнітэту.

**–** Беспрацоўны. Апошнія 14 гадоў Андрэй Саннікаў не мае сталай працы. Для выбаршчыкаў гэта будзе адным з пунктаў недаверу да кандыдата. Дзяржаўныя тэлеканалы і газеты таксама могуць учапіцца за гэты факт з біяграфіі.

## 5. Выгляд

**+** Пасля працы на дыпламатычнай ніве ў Андрэя Саннікава засталіся добрыя сувязі за мяжой. І найперш — у ЗША. Напэўна, з усіх беларускіх палітыкаў ён найчасцей робіць працоўныя паездкі ў Вашынгтон. Ён мае кантакты ў Дзярждэпартаменце. У спадчыну ад дыпламатычнай працы ў Саннікава засталося добрае разуменне міжнародных палітычных працэсаў і досыць цэласнае бачанне бягучай сітуацыі ў краіне і свеце, якога бракуе многіх іншым яркім асобам у апазіцыі.

**–** Непрывабны выгляд. Густая барада і сутуласць не дадаюць іміджу Саннікава плюсаў. Але ад «хартыйцаў» можна чакаць яркіх і запамінальных крокаў. Таму магчымасці, што перад выбарамі Саннікаў паўстане ў новым выглядзе, выключаць не даводзіцца.

**ЗП**

# Улада і бізнэс знайшлі кантакт

Міністэрства эканомікі абяцала прыслухацца да кожнай прапановы бізнэс-супольнасці.

10 сакавіка ў мінскім гатэлі «Беларусь» прайшла Асамблея дзелавых колаў. Арганізатары, сярод якіх былў Мінскі саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў пад кіраўніцтвам Уладзіміра Карагіна, у чарговы раз спрабавалі дасягнуць узаемапаразумення з уладай. Асамблея з запланаванай прэзентацыяй «Нацыянальнай платформы развіцця бізнэсу» мусіла адбыцца пасля таго, як прэм'ер Сяргей Сідорскі даў бы ацэнку міністэрскаму плану па лібералізацыі эканомікі на гэты год. Да сярэдзіны сакавіка чыноўнікі свае ідэі так і не сфармулявалі, таму Асамблею прыйшлося пераносіць на тыдзень пазней. У выніку ж, па дзіўным супадзенні, дзве сустрэчы — і міністэрская, і незалежная — прайшлі ў адзін дзень.

Запрошаныя госці прадстаўлялі абодва лагеры — і ўладны, і грамадскі. Яраслаў Раманчук, Станіслаў Багданкевіч і Леанід Заіка суседнічалі з міністрам эканомікі Мікалаем Снапковым, яго намеснікам Андрэем Турам, кіраўніком Белстата Уладзімірам Зіноўскім і выконваючым абавязкі мэра Мінска Мікалаем Ладуцькам.

### Прадпрымальнікаў хацяб выслухоўваюць

Уладзімір Карагін акрэсліў, што шмат якія ідэі з мінулагодняй бізнэс-праграмы дзяржава ўжо рэалізавала: «Гэта і плоская шкала падаткаабкладання, і спрашчэнне рэгістрацыі, і адмена шэрагу падаткаў». Са 145 пунктаў платформы-2009 было выканана 62. Зразумела, што пакуль што прадпрымальніцкая супольнасць не ў стане прабіваць свае ідэі сілай, але да іх меркавання сталі прыслухоўвацца. Як паведамляла «НН» у папярэднім нумары, улады гатовыя адступіцца і дазволіць індывідуальным прадпрымальнікам наймаць на працу не толькі сваякоў. Маўляў, нават міністр эканомікі Мікалай Снапкоў падтрымлівае ідэю. Па ўдакладненай інфармацыі, прыняцце адпаведнага ўказа чакаецца ў чэрвені.

З ноу-хау — спецыяльныя гарантыйныя фонды, якія возьмуць на сябе абавязацельствы па вяртанні крэдытаў. Сярод ідэй, ухваленых абодвума бакамі, была названая яшчэ і распрацоўка закона «Аб прыватна-дзяржаўным партнёрстве».

«У цяперашніх умовах мы павінны прапанаваць бізнэс-супольнасці актыўна, разам вырашаць праблемы. Патрэбная кансалідаваная пазіцыя», — мяркуе намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур.

Але не ўсе прапановы прадпрымальнікаў знаходзяць разуменне. Напрыклад, дзяржава не збіраецца адмяняць абавязковы продаж валютнай выручкі. «Гэтая мера несвоечасовая», — мяркуе прафесар Тур.

### Штрафы ўзлятуць услед за базавай велічынёй

Вырашана, што сёлета істотна зменіцца базавая велічыня. «Яна будзе павышацца некалькі разоў на працягу года, — заявіў Уладзімір Карагін. — У сувязі з гэтым бізнэсколы настойліва просяць «прывязаць» стаўку арэнднай платы да нейкай іншай велічыні». Паводле размоваў, павелічэнне будзе «разбітае» на чатыры этапы.

Варта нагадаць, што раней стаўка змянялася ў залежнасці ад еўра, і толькі нядаўна была прывязаная да базавай велічыні, якая трымаецца на адным і тым жа ўзроўні — 35 тысяч рублёў — з лістапада 2007 года.

Ад яе памеру залежаць, у прыватнасці, памеры штрафаў, дзяржаўных паслуг, членскіх узносаў (глядзі ўрэзку).

### Мільённыя інвестыцыі ў посуд

Кіраўнік Навукова-даследчага цэнтра Мізэса Яраслаў Раманчук пад рогат прысутных пералічыў самыя абсурдныя, на ягоную думку, ідэі ўладаў. Напрыклад, у Дзяржаўнай праграме інавацыйнага (!) развіцця Беларусі закладзеныя выдаткі памерам $1,2 мільёна для вытворчасці аднаразовага посуду. «З якога часу аднаразовы посуд стаў інавацыяй?!» — прагучала рытарычнае пытанне.

Па афіцыйнай статыстыцы, 87% у аб'ёме вытворчасці рыбы ў Беларусі займае карп. Прадстаўнікі міністэрства сельскай гаспадаркі прызнаюць, што «вырошчваць карпа эканамічна нявыгадна», але адмаўляцца ад яго ніхто не збіраецца. Больш за тое, менавіта на карпа будзе рабіцца стаўка і ў наступныя гады. Вырашана ствараць новыя прадпрыемствы. Загадзя стратныя.

**Яўген Васількоў**

**Некаторыя прапановы прадпрымальніцкай бізнэс-платформы:**

- стварыць роўныя ўмовы доступу да рэсурсаў для дзяржавы і прыватніка;
- адмяніць дзяржаўнае рэгуляванне цэнаў ва ўсіх сферах, апроч сітуацый з прадпрыемствамі-манапалістамі;
- забараніць прыманне дакументаў задняй датай;
- стварыць Дзяржаўны антыманапольны камітэт;
- стварыць сістэму прыцягнення ашчаджэнняў грамадзян (вэксалі, аблігацыі) прыватнікамі;
- адмяніць манаполію «Белтэлекама»;
- адмяніць катэгорыі і абмежаванне нацэнак для аб'ектаў харчавання;
- адмяніць планы па зборы штрафаў.

**Што ўзрасце ўслед за базавай велічынёй:**

- зарплаты бюджэтнікаў (ад базавай велічыні залежыць стаўка першага разраду);
- прэміі;
- дапамога беспрацоўным;
- дзяржаўныя паслугі (напрыклад, афармленне пашпарта);
- паслугі судоў;
- членскія ўзносы.

## Халява скончылася

Праз тры месяцы мінскія паркоўкі зноў стануць платнымі.

З 1 студзеня гэтага года ў Мінску былў адменены мясцовы збор за паркоўку на стаянках горада. Мала хто са сталічных аўтааматараў тады заўважыў, што працэдура зусім не аднабаковая. Улады папярэдзілі, што перавядуць аплату ў іншую плоскасць.

Ідэя заключалася ў тым, каб прыбраць зборы, якія ўсталёўваюцца мясцовымі органамі, і замяніць іх агульнай, загадзя вядомай велічынёй. Пакуль новыя лічбы не прыдумалі і не прынялі, бесправаваая паўза зацягнулася на тры месяцы.

9 сакавіка выйшаў указ №143, які ўвёў плату за стаянку на паркоўцы. Цяпер вызначаецца яе памер. Улады абяцаюць, што тарыфы будуць не вышэйшыя за папярэднія.

**ЯМ**

## Дэвальвацыя з пачатку года склала 3%

Нават летась рубель падаў не так хутка.

Апошнія дні беларускі рубель зніжаецца ў адносінах да ўсіх трох валют: і даляра, і еўра, і расійскага рубля. Амерыканская і расійская валюта пры гэтым шторазабнаўлялі свае гістарычныя максімумы.

За апошні тыдзень даляр даражэў чатыры разы. Цяпер ён ужо ацэньваецца ў 2961 рубель, а ў абменніках дасягае 2990 рублёў. У адзін з дзён курс у абменніках нават пераадольваў трохтысячную псіхалагічную мяжу.

Расійскі рубель таксама ставіў рэкорд за рэкордам — пяць дзён запар — і без праблем перайшоў мяжу ў сто рублёў. Ягоны курс роўны 100,94 рубля.

Дасягнуўшы свайго дна, пайшоў уверх і еўра. Няхай ягоны курс — 4068,12 рубля — пакуль што далёкі ад максімуму, на гэтым тыдні эксперты чакаюць працяг росту еўрапейскай валюты. Хутчэй за ўсё, за кошт даляра.

Агулам, з часу аднамомантавай 20%-най дэвальвацыі беларускі рубель апусціўся яшчэ на 11%.

**ЯВ**

## Больш крэдытаў — малых і вялікіх

Міністэрства гандлю плануе спрасціць працэдуру выдачы льготных крэдытаў на пакупку беларускіх тавараў. Цяпер для атрымання грошай (максімум — 10,5 мільёна рублёў) патрэбны пяць папераў.

Неўзабаве сітуацыя зменіцца. Дастаткова будзе прынесці даведку аб даходах і пашпарт. Астатнюю інфармацыю, у тым ліку крэдытную гісторыю, банк збярэ сам.

Крэдыты выдаюцца пад 10% на тры гады малазабяспечаным сем'ям — калі даход на аднаго чалавека ў сям'і не перавышае 1 млн 136 тысяч рублёў.

Паведамляецца, што за апошні год насельніцтва атрымала 4805 льготных спажывецкіх крэдытаў. Іх агульны памер склаў 19,8 мільярда рублёў.

**ЯВ**

### СЦІСЛА:

**Павінны $22 мільярды**

Замежны доўг Беларусі перавысіў $22 мільярды. За год ён павялічыўся на 45%. Яшчэ год таму паказчык складаў $15,1 мільярда.

**Афшор для імігрантаў**

Праграма прыцягнення замежных грошай працягваецца. Прэзідэнцкі ўказ №143 вызваляе імігрантаў ад падаходнага падатку на пяць гадоў, калі яны прывозяць з сабой у Беларусь грошы. Краіны з такім заканадаўствам адносяцца да «падатковых сховішчаў» — напрыклад, Коста-Рыка, Панама, у некаторай ступені Швейцарыя.

**ЯМ**

### КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

## Канфіскавалі нават «Доктара Хаўза»

Ператрусы прайшлі ў аўторак на офісах «Хартыі-97» і «Народнай волі», у кватэрах журналістаў Наталлі Радзінай і Марыны Коктыш, палітыка Андрэя Саннікава.

Апошні раз такія масавыяператрусы і вобшукі на кватэрах недзяржаўных журналістаў і рэдакцыйных офісах адбываліся 27 сакавіка 2008 года. Тады міліцыя і спецслужбы зладзілі паляванне на журналістаў «Белсата», «Рацыі» і «Еўрарадыё».

Кватэра «Хартыі-97» размяшчаецца ў будынку па адрасе Кірава, 23, ля будынка Цэнтральнага суда Мінска. Туды прыйшлі пасля 15-й гадзіны. Налётчыкаў было восем чалавек.

Калі рэдактар сайту Наталля Радзіна адмыкала дзверы, міліцыянты наляцелі на яе з верхняга паверха, прычым адзін з іх ударыў журналістку ў твар.

Адзін з візітантаў прадставіўся следчым Аляксандрам Чуем, двое іншых адрэкамендаваліся капітанамі міліцыі, але прозвішчаў не назвалі, іншыя проста «сціпла» ўварваліся ў кватэру.

Наталля Радзіна зазначае, што нехта з іх быў у чорнай масцы. Гэты выкрыкваў фашысцкія лозунгі ды жартаўліва салютаваў нацысцкім вітаннем.

Канфіскаваныя кампутары запакавалі ў чорныя пластыкавыя пакеты без перапісвання серыйных нумароў. Тэхніку пагрузілі ў адмысловую машыну.

Следчы Чуй патлумачыў, штоператрусы звязаныя з справай аб паклёпе на былога старшыню Гомельскага абласнога КДБ Івана Каржа. Па ёй ужо праходзіла некалькі і допытаў, але не такіх масавых.

Потым тая самая каманда, нават з тымі ж панятымі, накіравалася ў рэдакцыю «Народнай волі» на вуліцу Энгельса. Канфіскавалі працоўны камп'ютар шэф-рэдактара выдання Святланы Калінкінай. Журналісты паказалі паперу, згодна з якой Святлана Калінкіна з'яўляецца галоўным рэдактарам «Хартыі-97».

Калінкіна спрабавала патлумачыць, што гэта абсурд, але тлумачэнні не спынілі няпрошаных візіцёраў, і яны сталі праводзіцьператрус.

У хаце палітыка Андрэя Саннікава, блізкага да «Хартыі-97», канфіскавалі кампутар, вінчэстар ад яго, флэшкі, нават дыскеты, якімі ніхто не карыстаецца колькі год. А вось каардынатар «Хартыі-97» Дзмітры Бандарэнка папросту не пусціў у хату няпрошаных гасцей.

Здавалася б, працоўны дзень скончыўся і можна перадыхнуць. Аж не!Ператрусы працягнуліся. Гэтым разам прыйшлі дадому да ўсё той жа Наталлі Радзінай і журналісткі «Народнай волі» Марыны Коктыш. Апошняй падалі службовую машыну, каб хутчэй давезці дадому. Там у яе канфіскавалі нават дыск з серыялам «Доктар Хаўз».

З чым могуць быць звязаныя гэтыяператрусы? Найперш прыгадваецца заява Андрэя Саннікава аб намеры ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах (старонка 3). А таксама гэта можа быць спроба спецслужбаў запалохаць незалежных журналістаў. Асабліва тых, якія пішуць пра гучныя справы.

**Алесь Пілецкі, Зміцер Панкавец**

# Наступны прыпынак — «Плошча Незалежнасці»

Перамога тых, хто задрапваў «Плошчу Леніна» на схемах метро.

Станцыі вернуць назву «Плошча Незалежнасці». Такое рашэнне прыняла камісія па найменаванні і перайменаванні вуліц Мінгарвыканкама. Аднчасова вернуць гістарычныя назвы некаторых вуліц. Рэвалюцыйная стане Койданаўскай, Герцэна — Бернардынскай, Дзімітрава — Пятніцкай, Камунальная — Траецкай, Вызвалення — Уваскрасенскай, Гандлёвая — Зыбіцкай, Віцебская — Нямігa-Ракаўскай.

Але найбольшы культурны сігнал — змена назвы метро. «Плошчай Незалежнасці» станцыя стала называцца ад пачатку 1990-х, калі была перайменаваная сама плошча. Дзесяць гадоў у цягніках метро аб'яўлялі «Плошчу Незалежнасці». Аж у чэрвені 2003-га Мінгарвыканкам раптоўна «ўспомніў», што дакументальнага рашэння пра перайменаванне не было і фармальна станцыя ўвесь час заставалася «Плошчай Леніна». З дынамікаў загучаў абсурд: «Станцыя «Плошча Леніна», выхад да плошчы Незалежнасці».

Беларускіх незалежнікаў дзеянні чыноўнікаў абурылі. Яны былі расцэненыя як свядомая спроба прыніжэння нацыянальнага пачуцця.

На працягу ўсіх гэтых гадоў неабыякавыя рознымі спосабамі выказвалі пратэст. На схемах ліній метро ў вагонах цягнікоў і на станцыях Леніна выдрапвалі і крэслілі. За што атрымлівалі штрафы. Апошнім у 2009-м затрымалі актывіста Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Кастуся Шыталя. Першамайскі суд Мінска аштрафаваў яго на 1 050 000 рублёў за «наўмыснае пашкоджанне дзяржаўнай маёмасці».

Дарэчы, на замену саміх літар «Плошча Леніна» Мінгарвыканкам яшчэ ў 1993-м выдаткаваў 12,5 тысячы даляраў. Але літары засталіся на сцяне станцыі да сёння. А тыя грошы выпарыліся.

Пакуль дакладна невядома, калі ў вагонах метро зноў загучыць: «Наступная — «Плошча Незалежнасці». Прынамсі, ва ўпраўленні мінскага метрапалітэна аб планах вяртання назвы даведаліся ад журналіста «НН».

Цяпер пойдзе двухтыднёвае абмеркаванне праекта перайменаванняў. Потым мусіць быць рашэнне Мінгарвыканкама і разгляд дэпутатаў гарсавета, пасля чаго дакумент набудзе моц. Агулам працэдура ўзгадненняў можа заняць 3—6 месяцаў. Затое рашэнне будзе задакументаванае і «асадзіць назад» болей магчымасці не будзе.

**Наста Шамрэй**

**Камісія па найменаванні і перайменаванні вуліц**
складаецца з чыноўнікаў Мінгарвыканкама: намесніка мэра па культуры і адукацыі, начальніка ўпраўлення культуры, галоўнага мастака; з дэпутатаў, прадстаўнікоў грамадскасці — дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Алы Галубовіч, гісторыка Уладзіміра Дзянісава, прафесара Адама Мальдзіса.

**Кастусь Шыталь: У перайменаванні станцыі ёсць і нашая заслуга**
Докшыцкі хлопец Кастусь Шыталь быў апошнім, каго аштрафавалі за здзёртыя са схемаў метрапалітэна ў вагонах падземкі налепкі «Плошча Леніна» (у кастрычніку 2009 года). Ён мяркуе, што ў вяртанні станцыі метро ёсць і заслуга тых, хто мэтанакіравана здзіраў налепкі. «Улады не спяшаюцца змяняць савецкія назвы. А тут хутчэй надакучылі гісторыі з падрапанымі схемамі ў вагонах».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

АПЫТАННЕ «НН»

## Такі нацыянальны герой Савецкага Саюза

Як людзі ставяцца да перайменавання станцыі метро «плошча Леніна» на «плошчу Незалежнасці» і якую вуліцу хацелі б перайменаваць самі?

**Зінаіда Сямёнаўна, 53 гады:**
А што, там сёння метро Леніна? А не метро Незалежнасці? Мне ўсё роўна. Я думаю, што людзей дзевяноста дзевяці працэнтам усё роўна, дзе і як называецца.

**Віялета, 36 гадоў:**
Трэба называць вуліцы Мінска прыгожымі імёнамі, як у песні: вуліца Ліловая, вуліца Бэзавая... Да палітыкаў па-рознаму ставяцца, а жыццё павінна быць прыгожым.

**Аляксандра і Маргарыта, 18 і 19 гадоў:**
Здаецца, Ленін — такі нацыянальны герой Савецкага Саюза, і ён паўсюль паважаны. Чаму б не пакінуць хаця б станцыю метро ў яго гонар?

**Віктар Іванавіч, 46 гадоў:**
Наконт станцыі метро «плошча Леніна», якая знаходзіцца пад плошчай Незалежнасці? Гэта недарэчнасць.

І я б адну з вуліц, самую лепшую, назваў вуліцай Васіля Быкава. Напрыклад, вуліцу «газеты Праўда». Вуліца Васіля Быкава павінна быць у сталіцы канечне.

**НШ**

# Усё адно засмелая

Адхіленая ад пасады рэдактарка беларускага выпуску «Комсомолки».

У офісе выдання кажуць, што звальненне стала для іх поўнай нечаканасцю. Гэтак жа, як некалькі гадоў таму нечаканасцю стаў аналагічны выпадак з Юліяй Слуцкай.

Звальненне супала з вынясеннем газеце другога за год папярэджання ад Міністэрства інфармацыі.

Алена Міронава заняла рэдактарскі фатэль пасля таго, як маскоўская адміністрацыя «Комсомольской правды» в Беларуси» 1 лістапада 2006 года пастанавіла звольніць з пасады Юлію Слуцкую. Да таго Міронава займала пасаду рэдактара рэкламна-інфармацыйнай газеты «Ва-Банк».

Пры Слуцкай «Комсомолка» вылучалася большай незалежнасцю. Пры Міронавай яна асвятляла палітычныя тэмы асцярожней. Аднак газета захавала вялікі аб'ём вострасацыяльных матэрыялаў.

У лістападзе 2009 года «КП в Беларуси» атрымала першае папярэджанне ад Міністэрства інфармацыі, у адзін дзень з «Нашай Нівай» і «Народнай воляй». Намінальна, як і «НН», за публікацыю неправеранай інфармацыі вакол эпідэміі сезоннага і свінога грыпу ў краіне.

**Сяргей Гезгала**

# Блогер Ліпковіч кончыў сцябацца

Яўген Ліпковіч заявіў аб выхадзе з кампаніі па выбарах у дэпутаты Мінгарсавета.

Ліпковіч збіраў подпісы для вылучэння кандыдатам у дэпутаты па Валгаградскай выбарчай акрузе №54. Паводле яго слоў, кампанія была эксперыментам. Блогер збіраўся праверыць ступень уплыву на краіну інтэрнэта, які з 1 ліпеня будзе больш жорстка рэгуляваца дзяржавай у адпаведнасці з указам прэзідэнта № 60.

Ліпковіч адзначыў, што від заінтэрв'ю з заявай аб намеры балатавацца «за адзін дзень дало 17 тыс. закачак». Ініцыятыўная група колькасцю 10 чалавек была цалкам сфармавана праз інтэрнэт.

Аднак толькі тры з 153 сабраных подпісаў, якія не выклікалі сумнення, былі атрыманы з дапамогай сусветнай сеткі. «Гэта нават не статыстычная пагрэшнасць, — адзначыў Ліпковіч. — Інтэрнэт і сацыяльныя сеткі ў нашай краіне не маюць ніякага ўплыву, што і натрабавалася даказаць. Тыя, хто рыхтаваў указ № 60 аб рэгуляванні байнэта, — сапраўдныя параноікі, якія баяцца ўласнага ценю».

Паводле слоў Ліпковіча, у яго няма палітычных амбіцый, а духоўна ён належыць да пакалення, «якое гаварыла, што лепш лезці ў гразь, чым у палітыку». У гэтай сувязі блогер вырашыў не здаваць сабраныя подпісы.




Падчас кампаніі Ліпковіч заяўляў аб неабходнасці захавання сталічнага Севастопальскага парка. Паводле яго меркавання, за яго лёс можна не трывожыцца. У прыватнасці, «з'явіліся рэальныя, а не намінальныя ўласнікі будаўнічай кампаніі, якая прэтэндуе на забудову парка». Пытаннем захавання парку будуць займацца іншыя кандыдаты па гэтай акрузе, лічыць Ліпковіч.

Сваю кампанію прэтэндэнт, паводле яго слоў, праводзіў за кошт уласных сродкаў. Расходы склалі 191 тыс. рублёў.

Ліпковіч адзначыў, што ўціску з боку ўлад не адчуваў.

**БелаПАН**

# Аўтар рамана «Параноя» прызначаны в.а. кіраўніка Дэпартамента палітычных навук ЕГУ

«Я хацеў бы паспрабаваць сябе ў новай ролі», — адзначае Віктар Марціновіч.

Аўтар скандальнага рамана «Параноя» Віктар Марціновіч прызначаны в.а. кіраўніка Дэпартамента палітычных навук Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (ЕГУ). Дагэтуль Віктар Марціновіч не займаўся палітычнай навукай. Ён вядомы як журналіст, культуролаг, пісьменнік ды палітычны аглядальнік.

Прызначэнне цікавае тым, што пасада вымагае наяўнасці навуковага бэкграўнду ў адпаведнай дысцыпліне, які, прыкладам, мела Святлана Наумава, што займала гэтую пасаду дагэтуль.

Аўтар «Параноі» пацвердзіў у размове з «НН» дакладнасць атрыманай інфармацыі.

«Так, мяне насамрэч прызначылі часова выконваючым абавязкі кіраўніка Дэпартамента. Хто стане яго кіраўніком, будзе вядома толькі ў ліпені. Калі не будзе рэзкіх пярэчанняў супраць маёй кандыдатуры, то я хацеў бы паспрабаваць сябе ў новай ролі», — адзначыў В.Марціновіч.

Ён таксама заўважыў, што ў літоўскіх універсітэтах існуе шмат прыкладаў, калі аддзяленнямі паліталогіі кіруюць спецыялісты з сумежных галінаў. «Гэта пашыраная ў сучаснай адукацыйнай прасторы практыка», — паведаміў В.Марціновіч.

Пазалетась ён абараніў дысертацыю на тэму «Віцебскі авангард (1918—1922): сацыякультурны кантэкст і мастацкая крытыка». Галоўная ягоная праца — пасада намесніка рэдактара «БелГазеты».

**Алесь Пілецкі**

# «Таёта RAV-4» Марыны Коктыш завісла на мытні

Марына гнала нованабыты аўтамабіль з Літвы.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Беларускія памежнікі паведамілі, што гэтая машына заяўлена ў міжнародны вышук. Са словаў журналісткі, літоўскі бок абвяргае гэтую інфармацыю.

12 сакавіка ў 14.30 на памежным пераходзе «Каменны лог» была затрыманая журналістка газеты «Народная воля» Марына Коктыш. Яна гнала праз мяжу набыты ў Вільні аўтамабіль. Беларускія памежнікі паведамілі, што яе аўто заяўленае ў міжнародны вышук. Журналістка на знак пратэсту супраць дзеянняў мытнікаў абвясціла галадоўку. Яна каля сутак правяла на мяжы ў чаканні дакументаў з Вільні, каб пацвердзіць законнасць набыцця аўто.

Марына Коктыш кажа, што хвалявалася, калі ехала за мяжу, бо яшчэ добра памятае, як у маі мінулага года яе фактычна перад самым адлётам у Страсбург знялі з самалёта і адвялі на асабісты надгляд. Але такога павароту падзеяў усё ж не чакала. «Я набыла аўто праз сеціва. Гэта «Таёта-RAV-4» 2001 года. У Літву машына трапіла з Францыі, была афіцыйна зарэгістраваная. Ад'ездзіла па літоўскіх дарогах прыблізна год», — расказвае Марына Коктыш. Па яе словах, продаж машыны афіцыйна аформілі ў Літве, як і дакументы на вываз на літоўскай мытні. І ні ў кага з літоўскіх службоўцаў аўто не выклікала пытанняў. «На літоўскай мяжы машыну афармлялі каля гадзіны, правяралі па ўсіх базах», — кажа журналістка. Таму затрыманне на беларускім баку для яе стала поўнай нечаканасцю: «Я ўжо ўсім сваім смскі паспела даслаць, што ўсё добра, мяжу пераехала».

З мытні журналістка патэлефанавала ў мінскі «Таёта-Цэнтр», дзе ёй пацвердзілі, што нумары кузава і рухавіка яе машыны супадаюць з іхняй базай. Марына рэгулярна тэлефануе літоўскаму прадаўцу. «Ён таксама вельмі перажывае. Паводле дамовы, прадавец нясе ўсю адказнасць за прададзенае аўто. І ён мяне супакойвае, што ўсё будзе добра, бо дасканала праверыў машыну па ўсіх магчымых базах».

Журналістка кажа, што цяпер яе «Таёта» стаіць на ашмянскай мытні. Працэдура экспертызы можа расцягнуцца на месяц, але яна спадзяецца, што ўсё зробіць у самыя кароткія тэрміны, як таго патрабуе мытны кодэкс Беларусі.

Нагадаем, што 17 лютага 2010 г. у рэдакцыі газеты «Народная воля» супрацоўнікі Ленінскага РУУС сталіцы правяліператрус. У выніку былі канфіскаваны сістэмны блок камп'ютара, на якім працавала Марына Коктыш.

**Сямён Печанка**

# Беларускі шпіён у польскай суперспецслужбе

Ягоную сувязную палякі адшукалі на аўстрыйскай інтэрнэт-старонцы знаёмстваў у рубрыцы «Russische Frauen».

Адзін з супрацоўнікаў польскага Агенцтва ўнутранай бяспекі (скарочана — ABW, служба, якая займаецца ўнутранай бяспекай, сярод іншага контрвыведкай і змаганнем з тэрарызмам, аховай канстытуцыйнага ладу Польшчы) супрацоўнічаў з беларускай выведкай.

Гэтая інфармацыя з'явілася ў справаздачы ABW парламенту. Працэс па справе былога супрацоўніка Роберта Р. вядзецца ў Беластоку. Затрымалі яго ў лютым 2008 года. Аднак пазней адпусцілі з-пад варты, і сёння Роберт Р. знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе і самастойна з'яўляецца на судовыя пасяджэнні. Ад любых кантактаў з прэсай ён ухіляецца.

Аднак у рапарце ABW ёсць іншае прозвішча — Вольга Саламенік, грамадзянка Беларусі, якая нібыта мела быць сувязной шпіёна.

Гэтая спадарыня пару гадоў валодала фірмай «Містраль» у Беластоку, а пасля арышту Роберта Р. знікла. Зараз яна знаходзіцца ў агульнапольскім вышуку. Аб Вользе Саламенік вядома таксама няшмат: нарадзілася 29 ліпеня 1967 года ў Малой Бераставіцы, у Беластоку жыла на вуліцы Пяткевіча, 1.

Аднак знайшла сувязную не паліцыя, а журналісты. І ў вельмі нечаканым месцы — на аўстрыйскай інтэрнэт-старонцы знаёмстваў у рубрыцы «Russische Frauen» (расійкі), дзе тая шукае «мужчыну да 60 гадоў». Спадарыня Саламенік таксама пазначыла ў сваёй анкеце, што яна «дынамічная, вясёлая, любіць спорт, дзяцей, не паліць і ведае англійскую мову».

Цікава, што рапарт, які падала ABW парламенту з інфармацыяй аб беларускім шпіёне — першы дакумент такога тыпу ад 1990 г. — моманту стварэння спецслужбы (да 2001 — UOP). Летам мінулага года Агенцтва ўнутранай бяспекі паведаміла, што раскрыла расійскага шпіёна, які на працягу некалькіх год перадаваў у Маскву таемную інфармацыю, аднак падрабязнасцяў у той справе яшчэ менш.

**Алесь Пілецкі**

# Старыя правы кіроўцы стануць несапраўдныя ў Еўропе з 2011 года

Ужо цяпер беларускія кіроўцы, якія маюць правы савецкага ўзору, будуць мець праблемы пры ўездзе ў Расію. А 29 сакавіка 2011 года ўступаюць у сілу папраўкі да міжнароднай Канвенцыі аб дарожным руху. Для ўезду ў Еўропу кіроўцам трэба будзе мець правы новага ўзору.

Іх будуць выдаваць ад ліпеня 2010 года. Кошт новых правоў складзе адну базавую велічыню.

**СГ**

# Сантэхнік украў 180 ружаў і раздарыў жанчынам на вуліцы

42-гадовы сантэхнік з Мінска падазраецца ў тым, што 8 сакавіка скраў у прадпрымальніка 180 ружаў, якія захоўваліся ў падвале ЖЭСа.

Спачатку нецвярозы сантэхнік папрасіў прадпрымальніка прэзентаваць некалькі кветак для жонкі. А калі атрымаў адмову, украў ружы. 180 кветак ён раздаў сваёй жонцы, работніцам ЖЭСа і сустрэчным жанчынам за некалькі гадзін.

У Кастрычніцкім РУУС Мінска распачалі справу за крадзеж.

**АГ**



# Дзёрзкі рэцыдывіст уцёк з аперацыйнага стала

Злодзею ўдалося 11 сакавіка каля 5-й раніцы выслізнуць з хірургічнага аддзялення гарадской бальніцы. Хоць там яго ахоўвалі два супрацоўнікі міліцыі. Збеглага не раз судзілі, на гэты раз яго падазравалі ў рабаванні.

13 сакавіка Кудзелку злавілі: ён хаваўся ў каналізацыйным калектары ў мікраёне Слабада.

Цяпер Кудзелка ў ізалятары часовага ўтрымання, яго стан здароўя здавальняючы.

Супраць яго пачалі новую крымінальную справу за ўцёкі з-пад варты. Упраўленне ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама праводзіць спецправерку ў дачыненні да двух супрацоўнікаў лідскай міліцыі, з-пад канвою якіх збег Кудзелка.

**БЕЛТА**

# Раскрыта трайное забойства ў Гродне

Зладзеі выразалі сям'ю, а дзіця пацягнулі за сабой, каб яно не прагаварылася.

Злачынства здарылася ноччу 14 кастрычніка 2009 года ў кватэры па вуліцы Кабяка. Там пажарныя, якія прыехалі гасіць агонь, знайшлі трупы 65-гадовага гаспадара, яго 34-гадовай нявесткі і яе 52-гадовай знаёмай. Знік сын маладой жанчыны — пяцікласнік.

Следства ўстанавіла, што 28-гадовы і 29-гадовы раней судзімыя гродзенцы з'явіліся ў кватэры позна ўвечары 13 кастрычніка для выпіўкі. А тады без дай прычыны яны распачалі з гаспадарамі спрэчку і кухонным нажом забілі пенсіянера, а пасля і жанчын. Пасля гэтага яны падпалілі кватэру і сышлі, прыхапіўшы з сабой камп'ютар, іншыя рэчы і дзіця.

Намагаючыся з'ехаць як мага далей ад Гродна, злачынцы спынілі таксі і прапанавалі вадзіцелю адвезці іх у Мінск ці Маскву, маючы намер разлічыцца скрадзеным камп'ютарам. Атрымаўшы адмову, яны спрабавалі пырнуць яго нажом, аднак лёгкапараненаму таксісту ўдалося збегчы.

Затым злачынцы паспрабавалі скрасці «Аўдзі-80», але не змаглі. Толькі скралі з салона пасведчанне кіроўцы ўласніка, тэхпашпарт на аўто і іншыя дакументы.

Пасля гэтага гіцлі з дзіцем накіраваліся ў кватэру аднаго з іх, каб абмеркаваць далейшыя планы, дзе іх і затрымалі міліцыянты.

Цяпер нелюдзям выставілі цэлы букет абвінавачванняў.

**БелаПАН**

## ЗДАРЭННІ

### Інспектара ДАІ знайшлі з нажом у грудзях

Трагедыя здарылася ў Астраўцы 5 сакавіка. Раніцай 35-гадовы інспектар сабраўся на службу. І не прыйшоў. Цела знайшлі ля яго ж гаража. Паводле папярэдняй версіі, мужчына сам зрабіў сабе раненне. Праводзіцца праверка. У яго засталіся двое дзетак-школьнікаў.

### 73-гадовы рыбак умёрз у лёд

Пенсіянеру, які рыбачыў на Мінскім моры, раптоўна стала кепска, а побач нікога не было. Дык чалавек да ранку праляжаў на лёдзе, аж умёрз у палонку. З абмаражэннем небарака трапіў у бальніцу.

### Упершыню затрыманы мігрант з Панамы

11 сакавіка ачапленне палігона Крынічны пад Гроднам спыніла невядомага і перадало яго памежнікам. Каля сябе нелегальны мігрант меў 7 даляраў, прадукты, сёе-тое чым мыццагаліцца, два здымкі з google-карты і фота жонкі з дачкой. Панамец заявіў, што кіраваўся ў Літву да сям'і, якая нібыта жыве там.

**СГ; БЕЛТА; БелаПАН**

# Расійцы прапануюць плаціць за АЭС натурай

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Расія дзеліць скуру незабітага мядзведзя. Яна прапануе стварыць СП, каб прадаваць электрычнасць з беларускай АЭС. А інакш могуць і крэдыт на яе пабудову не даць.

Нібыта ўмову пра СП расійскі бок убіў нават у праект міжурадавага пагаднення аб будаўніцтве АЭС. Праз тое, маўляў, і тормаз: Мінск не згаджаецца.

Айчыннае начальства, здаецца, толькі зараз асэнсоўвае, як Масква абвяла вакол пальца з Мытным саюзам. Днямі Лукашэнка заявіў: мы ж згаджаліся на той саюз «без выняткаў», а так, маўляў, ці патрэбен ён нам.

Ружовыя надзеі на бязмытную нафту груба растаптаныя. А выйсці зараз — дык яшчэ і на газ мыта ўвядуць. Карацей, трапілі як шчупак у нерат.

Тое ж можа выйсці з праектам АЭС, з якім тутэйшае начальства так доўга насілася бы курыца з яйкам. Эксперты тлумачаць: праз стварэнне таго СП расійцы хочуць атрымаць нейкую гарантыю, што крэдыт будзе вернуты. То бок Беларусь фактычна будзе разлічвацца выпрацаванай на АЭС электрычнасцю.

**Урад хацеў аслабіць энергетычную залежнасць ад Расіі ў кааперацыі з Расіяй.**

Што ж, маскоўскую перастрахоўку ад кідалава, якога так багата ў дачыненнях заклятых саюзнікаў, можна зразумець. Але пра якую самастойнасць у атамнай энергетыцы можна весці гаворку? За што змагаліся?

У такім разе Масква, на думку эканаміста Леаніда Злотнікава, «будзе прэтэндаваць на права ўдзельнічаць у фармаванні цэнавай палітыкі, вызначаць, каму, куды і колькі электраэнергіі прадаваць. Апроч таго, не выключана, што ўдзел у СП дазволіць расійскаму боку кантраляваць не толькі фінансавыя плыні, але і працу самой станцыі».

Гэта ад пачатку было «геніяльнай» задумай: ладзіць цыклапічны праект аслаблення энергетычнай залежнасці ад Расіі у кааперацыі з... Расіяй.

Ці стане беларускаму начальству здаровага сэнсу ды рашучасці перарваць праект-пятлю, пакуль не позна? Ці так і будзем паўзці ў пашчу энергетычнага ўдава?

# Недасканалае, але ўтульнае свята

**Літва па-хатняму адсвяткавала 20-годдзе Незалежнасці. З Вільні піша Віталь Несцераў.**

11 сакавіка 1990 года Вярхоўны Савет Літоўскай ССР абвесціў Акт аб аднаўленні незалежнасці. Хоць сапраўдная незалежнасць надышла не адразу, літоўцы шануюць гэтую дату.

Святочную праграму да 20-годдзя Акта арганізатары паспрабавалі зрабіць сімвалічнай. Апроч юбілейнага пасяджэння Сойма – вайсковы парад як паказ моцы літоўскай арміі і яе здольнасці абараніць краіну. Святочнае набажэнства як духоўная аснова незалежнай нацыі. І, урэшце, двухбаковыя сустрэчы прэзідэнта Літвы з калегамі. Як прызнанне, што да голаса Далі Грыбаўскайце ў Еўропе прыслухоўваюцца.

### Нашы ў Вільні

Нягледзячы на запрашэнне, Аляксандр Лукашэнка да Вільні не даехаў. Замест сябе ён адправіў віцэ-прэм'ера Віктара Буру. Хоць дзяржаўнае інфармагенцтва БЕЛТА і паведаміла пра «насычаныя» беларуска-літоўскія перамовы — вядома ж, са слоў самога Буры, — удзел Беларусі ў свяце застаўся незаўважаным. Ці адпавядаў ранг чыноўніка іншым гасцям? Відавочна, не.

Былі прэзідэнты Польшчы, Славеніі, Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі. Але ўсё ж гэта складана назваць непавагай да такой ступені, як у сітуацыі з Расіяй. Замест запрошанага прэзідэнта Мядзведзева на цырымонію былі накіраваны... міністр транспарта. Маўляў, хіба Літва — гэта не там, дзе нашы цягнікі едуць у Калінінград?

Тым не менш, прадстаўнік Беларусі ў лік VIP-гасцей трапіў. Вядома ж, не Бура. Уганараваны быў Станіслаў Шушкевіч. Былы старшыня Вярхоўнага Савета сядзеў у ложы за спінай прэзідэнта Літвы. Шушкевіч быў, мусіць, адзіным чалавекам у зале, які нешта канспектаваў за кожным выступоўцам.

Выступу беларуса не чакалася, але калі загучалі інтрыгоўныя пафасныя словы, што «зараз мы пачуем прадстаўніка краіны, з якой Літва жыла разам у Вялікім Княстве Літоўскім, з якой мы рыхтуемся разам адзначаць юбілей Грунвальдскай бітвы...» — падумалася, што вось ён, анонс выхаду да трыбуны Шушкевіча. Не — размова ішла пра польскага прэзідэнта Качынскага.

### Заблытаны сцяг

У адрозненне ад беларускіх святаў і парадаў, літоўская цырымонія не была адпрацаванай да аўтаматызму. Як мінімум тысяча гледачоў глядзела на цырымонію ўзняцця сцягоў з-за спінаў журналістаў, якія стаялі на ўзвышэнні і засцілі відовішча. Задумвалася, што глядзець будзе на што — лунаюць сцягі трох балтыйскіх краін, якія сталі незалежнымі, але засталіся разам. Сімвал сяброўства, узаемападтрымкі і салідарнасці. Настрой арганізатарам папсавала надвор'е — узняты на вышыню літоўскі сцяг адразу ж абкруціўся вакол мацавання ды так і не разгарнуўся.

Кульмінацыйны момант парадаў у Беларусі — праход удзельнікаў ля прэзідэнцкай трыбуны. У Літве інакш. Парад — для гледачоў, а не прэзідэнтаў.

Калі вайскоўцы не заўсёды сінхронным крокам рушылі па цэнтральным праспекце, натоўп фактычна далучаўся да парада. Прапусціўшы апошняга жаўнера, людзі прыладжваліся за калонай. Дзеці мелі магчымасць сфатаграфавацца з удзельнікамі парада. У першую чаргу гэта было свята для іх.



**На ўрачыстасцях Дня незалежнасці Даля Грыбаўскайце выступала ў нацыянальным строі.**

АНТОН МАТОЛЬКА

## БЕЗ КАМЕНТАРОЎ

### Зімоўскі пра Пяткевіч і ж...у

У сваім блогу на сайце naviny.by кіраўнік НДТРК Аляксандр Зімоўскі зноў прайшоўся па Наталлі Пяткевіч і цынічна акрэсліў, хто ў сённяшняй Беларусі гаспадар сітуацыі.

«У ідэалагічнай вертыкалі дзейнічае закон электрычкі: ж... падняў — месца згубіў. Гэта аксіёма. А далей ужо — танчэй, таўсцей, гнутчэй, цвярджэй...»

«Трэба патлумачыць людзям, чаму сталі жыць горш, колькі гэта будзе працягвацца і ў колькі ім абыдзецца новы віток паляпшэння сітуацыі. Стала зразумела, што ўсё добра жыць ужо не будуць. Гэта капіталізм у чыстым выглядзе — камусьці Frank Muller, а камусьці «Луч». Ну, бывае, што камусьці аднаму — і тое, і другое, што не супярэчыць ідэі капіталізму».

### Пазняк пра выбары: Сітуацыя можа змяніцца так, што заўтра я прыеду ў Беларусь

Я не сказаў, што я не буду ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, — адзначыў Зянон Пазняк падчас тэлеперадачы «Свабода на Белсаце». — Я сказаў, што мы будзем праводзіць байкот. А што будзе... Сітуацыя можа змяніцца так, што я заўтра прыеду ў Беларусь».

## ЖАРТЫ

### «Частку пенсій і стыпендый вырашана выдаваць фішкамі з казіно»

**Якім чынам прыцягнуць у краіну інвестыцыі? Блогер Малішэўскі прапануе.**

— Замежным інвестарам можна піць піва на вуліцы і хадзіць у цэмры без флікера.

— Права на набыццё зямельных участкаў у Мінску будзе разыгрывацца ў казіно.

— Размяркоўваць студэнтаў у Чарнобыльскую зону будзе магчыма толькі пасля двухгадовай адпрацоўкі на прыватным прадпрыемстве.

— Шэнгэнскі атрымліваюць права наймаць на працу ідэолагаў не з ліку сваякоў.

— Іміграны, якія прывозяць капітал у Беларусь, вызваляюцца ад пені за пратэрміноўку аплаты камунальных паслугаў.

— Частку пенсій і стыпендый вырашана выдаваць фішкамі з казіно.

— Камітэту дзяржкантролю дазволена правяраць прадпрыемствы толькі па заяўцы самога прадпрыемства, але не часцей за два разы ў месяц.

— Сродкі, выдаткаваныя на адпачынак у Швейцарыі, не абкладаюцца падаткам.

— Статус «інвестыцыйнага агента» атрымае кожны англійскамоўны беларус.

— У рэстаранах вышэйшых катэгорый у кошт будуць уключаныя 10% на інвестыцыі.

**malishevsky.livejournal.com**

# Віцебскі чыноўнік абмяркоўвае міністра культуры

**«Он всегда позиционировал себя как «щирый беларус». Да, у него был определённый перекос в эту сторону».**

Віцебскі чыноўнік Андрэй Герашчанка, па сумяшчальніцтве старшыня грамадскага аб'яднання «Русский дом», пракаментаваў для расійскага інфармацыйнага агенцтва Regnum намер кінастудыі «Беларусьфільм» экранізаваць раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». Каментар Герашчанкі датычыў найперш размовы міністра культуры Беларусі Паўла Латушкі са сцэнарыстамі стужкі наконт будучай экранізацыі. Герашчанка адзначае: «Латушка доўгі час быў паслом Беларусі ў Польшчы. Ён заўсёды пазіцыянаваў сябе як «шчырый беларус», увесь час гаварыў на мове, намагаўся развіваць яе. Так, у яго быў пэўны перакос у гэты бок. Таму я думаю, што цяперашняя сітуацыя развіваецца не без яго асабістай пазіцыі», — заявіў А. Герашчанка.

Чыноўнік выказаў меркаванне, што экранізацыя рамана Караткевіча — звяно ў ланцугу антырасійскай кампаніі ў Беларусі.

Нагадаем, што Андрэй Герашчанка з'яўляецца начальнікам аддзела па справах моладзі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Віцебска. У студзені гэтага года ў якасці старшыні «Русского дома» Герашчанка даў інтэрвію расійскаму парталу «Материк», у якім паразважаў пра штучнасць беларускай мовы і культуры. Тое інтэрв'ю атрымала розгалас у беларускіх незалежных СМІ. Герашчанку прапанавалі звольніцца, але ён адмовіўся.

**Сямён Печанко**

# Першы за тэрарызм

**Упершыню ў найноўшай гісторыі Беларусі да суда дайшла справа за падрыхтоўку тэрарыстычнага акта супраць дзяржаўных чыноўнікаў.**



Юлія Дарашкевіч

**Абвінавачванне супраць Аўтуховіча грунтуецца на паказаннях Аляксандра Ларына.**

10 сакавіка ў Вярхоўным судзе пачаўся працэс ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, яго паплечніка Уладзіміра Асіпенкі, міліцыянта Міхаіла Казлова і шафёра Аляксандра Ларына.

У судовай клетцы сядзелі ўсе чацвёра абвінавачаных. Аўтуховіч, Асіпенка і Казлоў побач, а Ларын — на прыстойнай адлегласці ад іх. Да пачатку працэсу фатографам дазвалялі здымаць абвінавачаных. Потым Ларын заявіў, што выступае супраць відэа- і фотаздымак. Таму суддзя Аляксей Цяцюхін быў вымушаны іх забараніць.

### Аўтуховіч

Мікалай Аўтуховіч трымаецца на судзе досыць упэўнена. Ён не выглядае на хворага, нягледзячы на праведзеныя ў турме галадоўкі. Хіба што на твары адбіваецца стома.

Аўтуховіч пачаў гаварыць, калі суддзя запытаўся аб хадайніцтвах. Вязень адразу заявіў аб запалохваннях, псіхалагічным ціску на яго і іншых фігурантаў справы падчас следства. Казаў, што Лявонаву і Асіпенку прапаноўвалі даваць паказанні супраць яго, а ўзамен абяцалі свабоду. Так, Лявонава пагражалі «зачыніць на вялікі тэрмін». А Асіпенку за супрацоўніцтва абяцалі адпусціць на вяселле дачкі.

Мікалай Аўтуховіч таксама зазначыў, што па справе былі затрыманыя каля дзесятка чалавек. Прычым, усіх, каго хацелі дапытаць, затрымлівалі на 10 сутак. Азнаямленне з матэрыяламі справы праходзіла ў нялюдскіх умовах, пры тэмпературы 0 градусаў. Нават адвакаты сядзелі ў куртках і вымушаныя былі хадзіць па памяшканні, каб сагрэцца.

Аўтуховіч заявіў хадайніцтва аб дадатковым азнаямленні з матэрыяламі, а таксама капіяванні ўсіх тамоў справы. Ён прасіў дапусціць у якасці абаронцаў сваіх паплечнікаў па «афганскім» руху Алега Воўчака і Аляксандра Камароўскага. Таксама было агучанае патрабаванне аб праверцы дзеянняў супрацоўнікаў Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю, якія, паводле Аўтуховіча, перавышалі свае паўнамоцтвы падчас следства.

Аўтуховічу далі шэсць дзён на дадатковае азнаямленне з матэрыяламі, але ў ксеракопіі адмовілі. Як адмовілі і ў дапамозе Воўчака і Камароўскага. А вось праверку дзеянняў супрацоўнікаў УБАЗ пачалі.

Без адказу засталася скарга аб пераносе справы ў суд ніжэйшай інстанцыі — Гродзенскі абласны ці Мінскі гарадскі. Бо пасля Вярхоўнага суда прыгавор немагчыма абскардзіць.

### Абвінавачванні

Усе фрагменты справы датычаць 2004—2005 гадоў. Першае абвінавачванне зводзіцца да таго, што ў верасні 2004-га Мікалай Аўтуховіч разам з супрацоўнікам фірмы «Ніка-Транс» Аляксандрам Ларыным незаконна набылі агнястрэльную зброю — ручны карабін, з якога потым быў выраблены абрэз. Пры ператрусе ў лютым 2009 года дома ў Аўтуховіча знайшлі пяць патронаў ад гэтага карабіна.

Паводле версіі следства, у жніўні 2005 года Аўтуховіч з помсты даў каманду Казлу і Арцюкевічу падпаліць дом начальніка Ваўкавыскага РАУС Сяргея Кацубы. А пазней тыя самыя людзі, з тых самых матываў, падпалілі гараж і машыну падатковага інспектара Сяргея Мандзіка.

Вінаватыя ў тых падпалах даўно сядзяць за кратамі, але Аўтуховіч цяпер выступае як замоўца тых злачынстваў.

Пракурор Сафараў зачытаў, што Аўтуховіч стварыў арганізаваную злачынную групу, дзейнасць якой каардынаваў і планаваў. У склад групы ўваходзілі Ларын, Асіпенка і іншыя асобы. Гэтай групай нібыта быў набыты ручны гранатамёт РПГ-26, некалькі traцілавых шашак, электрадэтанатар, іншая зброя і выбуховыя рэчывы.

Летам 2005-га, паводле абвінавачвання, для захопу намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко, Аўтуховіч набыў у Маскве два электрашокеры.

У ліпені Аўтуховіч, Ларын і яшчэ адзін былы «афганец», сябар Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Уланаў (які быў не ў курсе, што адбываецца), таемна сачылі за пераcоўваннем Камянко па Гарадзе. Але нічога не зрабілі.

У кастрычніку 2005 года Аўтуховіч, ужо знаходзячыся ў СІЗА, працягваў кіраваць арганізаванай групай. Праўда, не гаворыцца, якімі шляхамі менавіта. З турмы ён перадаў распараджэнне рыхтаваць замах на старшыню гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанку.

З дапамогай Асіпенкі Ларын перавёз гранатамёт і выбухоўку ў Гродна. Схаваў яе на тэрыторыі школы-ліцэя №1, што за 140 метраў ад дома «губернатара», але давесці справу да канца так і не змог. На вуліцы пачалі з'яўляцца людзі, якія маглі перашкодзіць у тэракце, сцвярджаў пракурор.

### Ларын

Аляксандр Ларын апошнім часам працаваў на фірме Мікалая Аўтуховіча, быў шафёрам. Сам ён 1973 года, нарадзіўся ў расійскім Нальчыку. У Расіі некалі быў асуджаны за крадзеж. Атрымаў пяць гадоў з адтэрміноўкай на тры.

У судовай зале сядзеў у бейсболцы. На пытанне суддзі, чаму ў галаўным уборы, адказаў, што холадна.

У турму Ларын трапіў яшчэ раней за Аўтуховіча і Асіпенку — 31 студзеня 2009 года. Абвінавачванне ў значнай ступені грунтуецца на ягоных паказаннях.

Ларын быў адзіным на судзе, хто прызнаў сваю віну. «Часткова прызнаю, — сказаў ён. — Перавозка зброі, захоўванне, падрыхтоўка да ліквідацыі». У чым не прызнае, адказаць не змог.

Мікалай Аўтуховіч не прызнае сваёй віны. «У поўным аб'ёме?» — запытаўся суддзя. «У поўным», — адказаў Мікалай.

### Саўчанка

Галоўны пацярпелы па справе Уладзімір Саўчанка на суд не з'явіўся. Суддзя зачытаў ягоны зварот, дзе ён просіць разглядаць справу ў ягоную адсутнасць, бо знаходзіцца на лячэнні. Пасля адстаўкі на людскія вочы Саўчанка яшчэ ні разу не з'яўляўся. Пра ягоны лёс ходзяць розныя змрочныя чуткі.

Ваўкавыскі начальнік РАУС і падатковы інспектар лічаць, што ў Аўтуховіча маглі быць матывы для помсты. Таму не выключаюць магчымасці, што менавіта ён мог замовіць падпалы іхняй маёмасці. Аднак ніякіх наўпростых абвінавачванняў з іхняга боку не было.

### Камянко

Васіль Камянко з 1999 года працуе намеснікам міністра па падатках і зборах. Ад ліпеня 2003 года да лютага 2005 года Камянко курыраваў праверку кампаніі «Ніка-Транс». Па словах Камянко, гэтае даручэнне ён атрымаў ад міністра Канстанціна Сумара.

Камянко сцвярджае, што ў той час Аўтуховіч займаўся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю. «І кантралюючыя органы гэта пакрывалі», — зазначыў В.Камянко.

На пытанне, ці яму пагражалі, чыноўнік адказаў, што ўспрымае як пагрозы адкрытыя лісты Аўтуховіча да Лукашэнкі, дзе гаварылася пра «звядзенне рахункаў з чыноўнікамі, што твораць бясчынствы».

«Камянко даўно павінен сядзець у кайданках тут, замест мяне», — сказаў Аўтуховіч.

### Казлоў

Яшчэ адзін фігурант справы — супрацоўнік Гродзенскага абласнога аддзялення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю падпалкоўнік Міхаіл Казлоў.

Міліцыянта вінавацяць у тым, што ён меў звесткі пра тое, што рыхтаваў Аўтуховіч, але з асабістай зацікаўленасці і насуперак інтарэсам следства не выдаваў іх.

У Гродзенскай міліцыі Казлоў займаўся расследаваннем карупцыйных справаў у падатковых органах, міліцыі і іншых дзяржаўных установах.

Цікавы факт пра ўзаемадачыненні Казлова і Камянко. Гродзенскі міліцыянт у свой час завёў крымінальную справу на намесніка міністра. Ён абвінавачваў Камянко ў карупцыйных злачынствах. Якіх менавіта, не даў дагаварыць суддзя. Казлоў паспеў толькі сказаць, што Камянко дзейнічаў сумесна са старшынёй Кастрычніцкага раёна (напэўна, горада Гродна — «НН»).

Адпаведны акт быў пададзены міністру ўнутраных справаў Уладзіміру Навумаву. Камянко быў вымушаны шукаць абароны ва ўсемагутнага Віктара Шэймана. Урэшце, справу ўдалося замяць.

Казлоў быў знаёмы з Аўтуховічам ад 2003 года. Ваўкавыскі прадпрымальнік шукаў з ім сустрэчы, каб перадаць матэрыялы па карупцыі на некаторых падаткавікоў. У прыватнасці, фігуравалі прозвішчы Місько і Стасевіч. Казлоў вёў расследаванні гэтых злачынстваў.

Пасля першага арышту Аўтуховіча Казлоў часта сустракаўся з Уладзімірам Асіпенкам. Папярэджваў, што супраць яго можа таксама быць здзейсненая правакацыя.

Падчас адной з гутарак Асіпенка сказаў Казлову, што зараз «па просьбе аднаго адмарозка паедзе забіраць гранаты і боепрыпасы». Але міліцыянт не надаў тым словам ніякай увагі.

### Асіпенка

Былы вайсковец Уладзімір Асіпенка доўгі час працаваў у Ваўкавыскай падатковай інспекцыі. Але пасля праверкі, што ладзіў Камянко, страціў працу. Стаў дапамагаць у бізнэсе Мікалаю Аўтуховічу.

Асіпенка кажа, што не мог уваходзіць ні ў якую злачынную групу, як сцвярджае следства, хоць бы з той прычыны, што вельмі непрыязна ставіцца да Аляксандра Ларына. «Я нават не мог з ім знаходзіцца ў адным памяшканні», — кажа Асіпенка.

Па словах Асіпенкі, Ларын пачаў праяўляць актыўнасць ужо пасля першага арышту Аўтуховіча. Ён некалькі разоў праз сваю жонку шукаў кантактаў з Асіпенкам, прасіў у яго грошай. Цікавіўся, ці ведае ён дом, дзе жыве Саўчанка, на якой машыне ён ездзіць.

Яму патрэбна была тая інфармацыя для «нейкай акцыі». Асіпенка думаў, што гаворка вядзецца пра акцыю пратэсту супраць затрымання Аўтуховіча, але ніяк не пра замах.

Падчас адной з такіх размоваў Ларын сказаў, што трэба перавезці гранатамёт і гранаты ў Гродна. «Ты што, ваяваў у Афганістане?» — запытаўся Асіпенка. «Не, у Абхазіі», — адказаў Ларын.

У час апошняга спаткання з Асіпенкам у кастрычніку 2005 года Ларын паведаміў, што акцыя правалілася, а яму патрэбныя 2000 даляраў, каб з'ехаць у Маскву.

На момант здачы нумара «НН» у друк самога Мікалая Аўтуховіча і Аляксандра Ларына яшчэ не дапыталі. Тым не менш, сюжэту крымінальнай справы ўжо можа пазайздросціць любы дэтэктыў.

**Зміцер Панкавец**

# Генпракурор Васілевіч запярэчыў КДБ

**Гісторыя з арыштам старшага следчага па асабліва важных справах Генеральнай пракуратуры Святланы Байковай набірае абароты.**

Пакуль следчая застаецца пад вартай, у барацьбу за яе вызваленне ўключаюцца ўсё новыя і новыя сілы.

Нагадаем, Байкова была затрыманая ў лютым супрацоўнікамі КДБ па падазрэнні ў карупцыі. Размовы звязвалі арышт з тым, што Байкова вяла гучную справу брэсцкіх мытнікаў. Па справе ў якасці абвінавачаных праходзілі былы дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю і кіраўнік брэсцкага абласнога КДБ, былы намеснік старшыні КДБ генерал-маёр Анатоль Зарэцкі і некалькі дзясяткаў мытнікаў.

«Беспакаранасць брэсцкіх кантрабандыстаў забяспечвалі высокапастаўленыя супрацоўнікі КДБ, мытні і міліцыі. Але асаблівасць гэтай сітуацыі не столькі ў звычайным для Беларусі «крышаванні» злачыннай дзейнасці, а ў тым, што супрацоўнікі органаў бралі асабісты ўдзел у дзейнасці кантрабанднай мафіі і былі адным з неабходных звёнаў злачыннага ланцуга», — піша ў сваім звароце да генеральнага пракурора Беларусі Вячаслаў Дудкін, былы кіраўнік антыкарупцыйнага падраздзялення МУС.

Ён цяпер знаходзіцца ў Расіі, дзе, як сцвярджае, хаваецца ад пераследу беларускіх спецслужбаў. Зварот з'явіўся ў інтэрнэце на гэтым тыдні. В.Дудкін лічыць, што справа Байковай «замоўленая»




высокапастаўленымі чыноўнікамі, якія гэтак спрабуюць пазбегнуць пакарання. На думку капітана, улічваючы аб'ём і значнасць інфармацыі, якой валодае арыштаваная, яе жыццю ў СІЗА КДБ пагражае небяспека.

Генпракурор Рыгор Васілевіч пасля арышту Байковай асабіста ўзначаліў групу па расследаванні злачыннай дзейнасці на мяжы. Ён ад самага пачатку заяўляў, што ў яго няма інфармацыі пра незаконныя дзеянні падначаленай, і абскардзіў змяшчэнне пад варту Байковай у судзе Цэнтральнага раёна сталіцы. Аднак 15 сакавіка ягоны пратэст быў адхілены.

Але самім фактам абскарджання генеральны пракурор фактычна кінуў выклік КДБ. Цяпер ягоная пазіцыя супадае з міліцэйскай.

Толькі калі былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў фактычна схаваўся ў Расіі, дзе знайшоў сабе нейкую працу, то генеральны пракурор застаецца на сваім працоўным месцы.

**Віталь Несцераў**

# Адкуль гніе рыба?

**Некаранаваны злодзей у законе «Мацвей», крымінальны «брыгадзір» па мянушцы «Заяц»… Яны сталі ахвярамі бандыцкіх разборак яшчэ ў 1990–я. Іх цені знайшліся ў начальніцкіх крэслах.**

Галоўнае ўпраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі (ГУБЭЗ) МУС зацікавілася дзейнасцю прадпрыемства Упраўлення справамі прэзідэнта ГТПУП «Белрыба». МУС падымае старыя матэрыялы, нацэліўшыся на генеральнага дырэктара Генадзя Скітова. У фокусе —дзейнасць Скітова на пасадзе, яго адносіны з былым кіраўніком справаў прэзідэнта Мікалаем Дамашкевічам.

Скітова называюць легендарнай асобай, хоць шырокай публіцы ён мала вядомы. Да 45 гадоў ён здолеў стаць адным з самых вядомых дырэктараў Беларусі. Кіраўнік дзяржавы ўзнагародзіў яго медалём за працоўныя заслугі... Калі б пад нагамі не блыталася МУС, Скітоў увайшоў бы ў кіроўную эліту краіны.

Але яго кар'ерны рост пачынаўся пад іншым прозвішчам і ў зусім іншых універсітэтах.

Некаранаваны злодзей у законе «Мацвей» на світанні незалежнасці Беларусі прэтэндаваў на галоўную ролю ў новай крымінальнай прасторы. Ён падабраў пад сябе Мінскую вобласць, як яго кар'ера была перарваная канкурэнтамі.

У атачэнні «Мацвея» былі: крымінальны аўтарытэт Палішчук па мянушцы «Заяц», браты Эльkінды, будучы вядомы бізнэсовец Смансар. У аператыўных матэрыялах захавалася фота, дзе яны даюць клятву на магіле боса.

Пасля гібелі «Мацвея» ягонае месца заняў «Заяц». Набіраючы сілу, ён перастаў адлічваць грошы ў «казну», чым выклікаў гнеў тагачаснага касіра зладзейскага свету Беларусі Юрыя Палшкова па мянушцы «Барада». «Заяц» пачаў ні ў што не ставіць «сваіх». Калі адзін з удзельнікаў «брыгады» прыгнаў сабе з-за мяжы аўтамабіль, «Заяц» яго адабраў. Урэшце «Зайца» застрэлілі ў той самай машыне і спалілі.

Асноўным відам дзейнасці «Зайца» быў бязлітасны рэкет прадпрымальнікаў Барысаўскага раёна. Але перад смерцю аўтарытэт здолеў падмяць пад сябе дзяржпрадпрыемствы: арганізаваць канал уцечкі няўлічанай прадукцыі для перапродажу праз падкантрольных прадпрымальнікаў. Добры прыбытак даваў Барысаўскі мясакамбінат. У 90-я насельніцтва не было распешчанае мяснымі далікатэсамі.

Браты Эльkінды былі кімсьці накшталт кіраўнікоў-менеджэраў пры «Зайцу». Бацька Эльkіндаў працаваў у Барысаўскім выканкаме, кіруючы справамі экалогіі. Сын начальніка ДАІ Барысава таксама быццам бы ўваходзіў у кола набліжаных «Зайца».

Пасля забойства «Зайца» прыкрыццё перастала функцыянаваць, бо ніхто яму не плаціў. Па фактах дзейнасці брыгады (рэкет і забойствы) была распачатая крымінальная справа. Пад падазрэнне трапіла больш за дзесяць чалавек, у тым ліку Эльkінды.

Але справа была спыненая, і знішчаная ільвіная доля аператыўных матэрыялаў па дзейнасці брыгады «Зайца». Эльkінды пачалі новае жыццё. Дапамог Мікалай Дамашкевіч, які ў 1998 годзе быў пастаўлены кіраваць Мінскім аблвыканкамам. Бацьку братоў, Віктара Эльkінда, ён узяў дарадцам.

Менавіта ў той час на свет нарадзіўся новы чалавек — Генадзь Скітоў. Гэта адзін з Эльkіндаў узяў прозвішча маці і змяніў пашпарт.

У 1998 годзе Скітоў уладкоўваецца на Барысаўскі мясакамбінат. Пачынаў ці то ахоўнікам, ці то рабочым. Але ўжо ў 2002 годзе ён становіцца генеральным дырэктарам найбуйнейшага ў Беларусі мясакамбіната.

Яшчэ да знакавага прызначэння Скітоў пры падтрымцы таты і Мікалая Дамашкевіча спрабаваў выставіць кандыдатуру на выбары ў палату прадстаўнікоў. Але МУС не спаў. Тут жа падымаецца старая справа па брыгадзе «Зайца», якая перадаецца на расследаванне ў следчы камітэт МУС. Паводле некаторых звестак, у аператыўных матэрыялах МУС ёсць дадзеныя, як у другі раз прыпынялася справа. У іх канкрэтна гаворыцца, хто і якія намаганні прыклаў. У гэты ж час і брат Скітова, той самы, які даваў клятву на магіле «Мацвея», уладкоўваецца ў Мінаблвыканкам на адну з ключавых пасадаў.

Стаўшы генеральным дырэктарам ААТ «Барысаўскі мясакамбінат», Скітоў зрабіўся паважаным чалавекам. Ён вывеў прадпрыемства ў лік лідэраў галіны і пачаў атрымліваць узнагароды.

МУС некалькі разоў праз ГУБЭЗ спрабавала падабрацца да мясакамбіната, але атрымлівала адпор. Дамашкевіч быў на кані, сябраваў са старшынёй КДБ Сухарэнкам і сваю вотчыну бараніў жорстка.



**Палішчук («Заяц») і ягоныя таварышы на цэнтральнай плошчы Барысава. Другі злева Палішчук («Заяц»), першы справа Эльkінд/Скітоў.**

У чэрвені 2007 года Дамашкевіч быў вызвалены ад пасады. Але ўжо праз некалькі месяцаў быў прызначаны кіраўніком справаў прэзідэнта. Таму Скітова, якога Дамашкевіч прызначыў дырэктарам «Белрыбы», ніхто не чапаў. Толькі летась у сферу дзейнасці Скітова і Дамашкевіча паспрабаваў, не ведаючы броду, сунуцца ДФР КДК.

У лютым 2009 года ДФР правёў планавую праверку фінансава-гаспадарчай дзейнасці ГТПУП «Белрыба». Былі выяўленыя падазроныя зніжкі буйным аптовым пакупнікам, захоўванне на прадпрыемстве ікры са скончаным тэрмінам рэалізацыі.

Узнікла неабходнасць зрабіць выемку дакументаў на ГТПУП «Белрыба». Двое аператыўнікаў прыбылі на прадпрыемства, але Скітоў заявіў, што зможа паказаць патрэбнае толькі праз 10 дзён. У выніку на прадпрыемства прыбылі намеснік начальніка Упраўлення ДФР КДК па Мінску і Мінскай вобласці Чорны, начальнік аператыўнага ўпраўлення цэнтральнага апарата ДФР КДК Дзюкаў, намеснік дырэктара ДФР КДК Каваленка. Усе не ніжэйшыя за падпалкоўніка.

З Упраўлення справамі прэзідэнта з'явіўся дарадца Дамашкевіча, нехта Андрэеў. Калі супрацьстаянне дасягнула апагея, прыехаў сам Дамашкевіч. Яны заставаліся ў кабінеце з Каваленкам і Дзюкавым. Аб чым яны гаварылі, ніхто не ведае. Але перамагла дружба — Скітова з Дамашкевічам.

У выніку праверкі была распачатая крымінальная справа аб халатнасці па факце захоўвання пратэрмінаванай ікры. Справу перадалі ў пракуратуру і спынілі.

Паводле звестак «Ежедневника», цяпер ГУБЭЗ МУС збіраецца запатрабаваць матэрыялы леташняй праверкі ДФР КДК і ўсё ж вывучыць пытанне зніжак аптовым пакупнікам. Чым гэта скончыцца, пакажа час.

**«Ежедневник»**

# Рыгор Барадулін ужо дома

15 сакавіка народнага паэта Беларусі выпісалі з бальніцы Кіраўніцтва справаў прэзідэнта.

— Ён пачуваецца лепей, але галава не перастае балець. Яшчэ кашляе, што, па словах доктара, можа працягвацца з месяц. Ёсць невялікая тэмпература, але яна, дзякаваць Богу, не падымаецца па вечарах, як раней, — кажа жонка паэта, спадарыня Валянціна.

Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін быў дастаўлены ў аддзяленне рэанімацыі бальніцы Кіраўніцтва справаў прэзідэнта з дыягназам «левабаковая пнеўманія, ускладненая ацёкам лёгкіх». Сітуацыя была крытычная. Пэўны час да яго былі забароненыя наведванні нават блізкіх. Але дзядзька Рыгор адолеў хваробу.

У бальніцы 24 лютага ён сустрэў свой 75-гадовы юбілей.

**Кастусь Матушыч**

# Украінай кіруюць мультымільянеры

**Прыбытак міністраў вымяраецца дзясяткамі мільёнаў, а іх дамы — тысячамі квадратаў.**

Урад Януковіча склалі людзі, якія пачыналі прадаўцамі, маркшэйдэрамі, шахцёрамі. Цяпер яны належаць да ліку самых багатых людзей Украіны.

Пры гэтым самы багаты кандыдат у прэзідэнты Сяргей Цігіпка аказаўся толькі другім багацеем у рэйтынгу ўрада Азарава. Лідэрам тут стаў найбліжэйшы сябар мільярдэра Рыната Ахметава і новы віцэ-прэм'ер па Еўра-2012 Барыс Калеснікаў.

### Барыс Калеснікаў

У парламенце перад прызначэннем чыноўнікаў на пасады былі распаўсюджаныя іх аўтабіяграфіі. Факты з іх пралілі святло на паходжанне многіх уплывовых асоб.

Як высветлілася, сваю кар'еру Барыс Калеснікаў пачынаў прадаўцом, а ў гады перабудовы нават папрацаваў сталяром. І толькі пасля працоўных будняў на цэнтральным калгасным рынку Калеснікаў змяніў статус прараба на статус гендырэктара кампаніі «Юг».

Цяпер уладальнік кампаніі «Конці», якая выпускае слодычы і мае ўдзел у банках, уваходзіць у лік 50-ці найбагацейшых людзей Украіны.

Сукупны прыбытак зноў прызначанага віцэ-прэм'ера па пытаннях Еўра-2012 у 2008 годзе склаў каля $12 млн.

Згодна з дэкларацыяй, у Калеснікава ёсць зямельны ўчастак на 5 гектараў, кватэра 217 метраў і гараж на 30,6 квадратаў.

Калеснікаў прапісаны ў Данецку, хаця яго сям'я жыве ў Маскве, дзе вучыцца яго сын. Ездзіць Калеснікаў на статусных аўтамабілях «Мерсэдэс S-500» і «Мерсэдэс S-600 L».

Рахункі новага віцэ-прэм'ера складаюць дзевяцізначную лічбу — 109 млн грыўняў.

Калеснікаў з гонарам заявіў, што ён багацейшы за ўвесь «расійскі, украінскі і малдаўскі ўрады».

### Сяргей Цігіпка

Эканамічны віцэ-прэм'ер Сяргей Цігіпка ў 2008 годзе зарабіў больш за 4 мільёны даляраў.

У адрозненне ад Калеснікава, Цігіпка рабіў кар'еру на камсамольскай ніве. Але ўжо ў пачатку 1990-х узначаліў банк «Днепр», а затым — «Прыватбанк». З часам Цігіпка зрабіўся кансультантам Леаніда Кучмы, які і скіроўваў яго далейшую палітычную кар'еру.

### Андрэй Клюеў

Трэцяе месца ў рэйтынгу ўрадавых багацеяў займае віцэ-прэм'ер Андрэй Клюеў. Кандыдат тэхнічных навук, ён пачаў бізнэс з укаранення ўласных вынаходак у сферы будаўніцтва. Пасля наладзіў уласную вытворчасць, браў крэдыты. Потым пабудаваў падшыпнікавы завод. «Укрпадшыпнік» доўгі час быў ключавым прадпрыемствам братоў Клюевых.

У сярэдзіне 90-х Клюеў стаў намеснікам старшыні Данецкага аблсавета. Там перасекліся шляхі Клюева і цяперашняга прэзідэнта Януковіча, які ў той час быў кіраўніком Данецкай вобласці.

У 2009 годзе Клюеў зарабіў больш за мільён даляраў.

Яму належыць зямельны ўчастак плошчай звыш 9 гектараў. Гэта абнесеная гранітнай сцяной частка лесу са сваімі футбольнымі пальмамі, кортамі і дарогамі ў пасёлку пад Кіевам.



Клюеў валодае домам плошчай 2310 м² (!), кватэрай плошчай 31 м² і машынай Mercedes. Таксама сям'і Клюева належаць два аўтамабілі — спартыўны Porsche Carrera і пазадарожнік Audi Q5.

### Валерый Харашкоўскі

Не бядуе і Валерый Харашкоўскі, кіраўнік Службы бяспекі Украіны — аналага беларускага КДБ.

**Самыя багатыя — новыя віцэ-прэм'еры і кіраўнік спецслужбы.**

Харашкоўскі — гэта ўзор кар'еры хлопчыкаў эпохі заняпаду «саўка». Маці Харашкоўскага была буйным навукоўцам, але сын змог скончыць толькі сярэднюю школу. Пасля пайшоў працаваць вучнем токара, а затым — кіроўцам у заапарк.

І толькі пасля войска, у 1989-м, Харашкоўскі паступіў на юрфак універсітэта.

Першы капітал ён зарабіў на гандлі мэбляй. А ў канцы 90-х, прабіўшыся ў памочнікі прэм'ера Пуставойценка, пачаў пракладаць дарогу ў вялікую палітыку.

На працягу 2004–2005 гг. малады палітык засвяціўся ў Расіі на кіроўных пасадах у холдынгу «Еўраз». Але ўрэшце зноў вярнуўся ва Украіну, дзе ўзначаліў назіральную раду канала «Інтэр».

У статусе ўладальніка «першай кнопкі» краіны Харашкоўскі трапляе на пасаду намесніка сакратара Рады бяспекі, потым Юлія Цімашэнка прызначае яго кіраўніком мытнай службы, а адтуль Юшчанка пераводзіць яго ў СБУ на пасаду першага намесніка.

Яшчэ адзін надзвычайны штрых — у 34 гады Харашкоўскі стаў доктарам эканамічных навук!

Ягоны заробак як намесніка старшыні СБУ склаў усяго 3% ад ягоных даходаў за 2009 год.

Ва ўласнасці Харашкоўскага 98 гектараў (!) зямлі. Плошчу дома (або дамоў) сям'і Харашкоўскага складаюць астранамічныя 9 806 квадратных метраў. Ды яшчэ ён мае і кватэру — большую за тысячу метраў.

Акрамя таго, у валоданні сям'і Харашкоўскага цэлы аўтапарк: два Porsche, тры «Мерсэдэсы», Maybach даўжынёй шэсць метраў і Bentley.

Калі ў Януковіча стане кепска з фінансамі, ён зможа вывесці краіну з крызісу, пазычыўшы грошай у сваіх калег.

**Сяргей Гезгала**



## Найбагацейшы чалавек у свеце

**Гэта мексіканскі тэлефонны магнат Карлас Слім Элу.**

Чарговы рэйтынг найзаможнейшых людзей свету часопіса Forbes узначаліў мексіканскі магнат Карлас Слім Элу. Яго капітал дасягнуў $53,5 млрд. Зарабіў ён столькі на прыватызацыі нацыянальных тэлефонных сетак у 1990-я. Летась ён займаў трэцюю пазіцыю ў рэйтынгу. Крызіс мексіканца не зачапіў. За год ён павялічыў свой капітал на $18,5 млрд.

На другім месцы сёлета – заснавальнік Microsoft Біл Гейтс ($53 млрд), на трэцім – амерыканскі інвестар Уоран Бафет ($47 млрд).

**КМ**



## Самы дарагі знішчальнік Пентагона

**F–35 мае стаць увасабленнем магутнасці Захаду. На яго распрацоўку ўжо выдаткавана $45 млрд.**

F-35 Lightning II — гэта малазаўважны шматмэтавы знішчальнік-бамбардзіроўшчык, распрацоўкай якога займаецца кампанія Lockheed Martin з удзелам Northrop Grumman і BAE Systems. Самалёт распрацоўваецца ў трох варыянтах: наземны знішчальнік, палубны знішчальнік і знішчальнік са скарочаным узлётам і вертыкальнай пасадкай.

Выпрабаванні F-35 пачаліся ў снежні 2006 года. Разам з ЗША ў праекце бяруць удзел яшчэ Аўстралія, Вялікабрытанія, Данія, Канада, Нідэрланды, Нарвегія, Італія і Турцыя.

Сярод краін, якія ўжо аб'явілі аб жаданні набыць гэты самалёт, — Ізраіль і Сінгапур.

На распрацоўку новага самалёта затрачана $45 млрд, а канчатковая вартасць праграмы і ўвогуле невядомая.

F-35 Lightning II мае стаць увасабленнем магутнасці Захаду. На ім запланавана ўсталяваць навінку, — лазерныя гарматы. А таксама ўнікальная сістэма, што дазволіць пілоту бачыць скрозь самалёт — камеры будуць падаваць выяву на экраны шлема пілота ў залежнасці ад таго, у які бок пілот глядзіць.

F-35 здольны выконваць усе баявыя задачы — ад бамбардзіровак да агнявой падтрымкі пяхоты і знішчэння паветраных цэляў. Ніводзін самалёт не можа пахваліцца такой універсальнасцю.

**Алесь Пілецкі**




## Трагедыя Бэкхема

**Славуты футбаліст парваў ахілава сухажылле.**

Дэвід Бэкхем не зможа згуляць за зборную Англіі на сусветным першынстве ў Паўднёвай Афрыцы. Падчас матча італьянскага першынства «Мілан»—«К'ева» Бэкхем, які гуляе на правах арэнды за «Мілан», на роўным месцы паваліўся і папрасіў замену. Дыягназ — «разрыў ахілавага сухажылля».

Пры такіх траўмах тэрмін пасляаперацыйнай рэабілітацыі складае 3—4 месяцы, і толькі потым гулец зможа прыступіць да лёгкіх трэніровак.

Траўма ахілавага сухажылля суправаджаецца рэзкім болем. Чалавек не можа нармальна хадзіць і падымацца на дыбачках. Сухажылле звычайна сшываюць, аперацыя доўжыцца каля гадзіны, затым сустаў замацоўваюць гіпсам. Нават пры паспяховай аперацыі нельга даць гарантыі поўнага аднаўлення функцый.

**СМ**

## Мэл Гібсан здыме фільм пра вікінгаў і кіне кіно

**У галоўнай ролі Леанарда Дзі Капрыа.**

«Думаю, што гэта будзе апошняя мая карціна», — кажа актор і рэжысёр Мэл Гібсан.

Ён не можа ўзгадаць ніводнага сапраўды ўдалага фільма пра вікінгаў. «Складаней за ўсё зрабіць гэтых хлопцаў сімпатычнымі, таму што насамрэч яны былі сапраўднымі монстрамі», — адзначыў рэжысёр.

У фільме частка герояў будзе размаўляць на старажытнаскандынаўскай мове. «Мы пастараемся паказаць гледачам усё, што адбывалася ў той час, з максімальна магчымай дэталізацыяй».

Гібсан заснаваў уласную кінакампанію ICON Production, выпрашыўшы паспрабаваць сябе ў ролі рэжысёра. Поспех яму прынесла эпічная драма «Адважнае сэрца».

У 2004 годзе Гібсан зняў фільм «Пакуты Хрыстовы», які меў вялікі поспех у пракаце.

Апошні на сёння фільм Гібсана — «Апакаліпсіс» (2006) — гістарычны эпас пра гібель цывілізацыі майя.

**КаМ**

# Вольскі адкрыў забытыя скарбы

«Белая яблыня грому» — новы аўтарскі праект Лявона Вольскага. Складанка з 12 песень на вершы класікаў: ад Міцкевіча і Купалы да Танка, Панчанкі і Барадуліна.

Класіка класікай, але музычнае суправаджэнне сучаснае: блюз, рок, рэп і хэві-мэтал. Вольскі спадзяецца, што гэты праект дапаможа сучаснай публіцы наноў адкрыць для сябе творы класікаў.

**«НН»: Танк, Куляшоў... Лявоне, мы нешта прапусцілі ў беларускай савецкай літаратуры? Вы адкапалі новы лірычны пласт?**

**Лявон Вольскі:** Нам напачатку дапамагалі выракацца сваёй спадчыны, а цяпер мы й самі навучыліся. Раней мы былі малапісьменныя і не чыталі, затое цяпер мы настолькі адукаваныя, што з пагардаю глядзім на гэтых «паэцікаў». Маўляў, хто яны такія?! Мы ж цяпер умеем пісаць лепей, чымся яны! Прынамсі, нам так падаецца. Тым часам, дзяржава з радасцю падтрымала гэткае стаўленне — каб не нараджаць куміраў (у савецкі час літаратараў народ шанаваў), і вось ужо і народу не трэба (шырокім масам), і нам — выпанчаным натурам.

**«НН»: Сяргей Дубавец у сваім эсэ «Ружовы туман» прапанаваў забыць савецкую беларускую літаратуру за яе бесхрыбетнасць.**

**ЛВ:** Гэтага рабіць дакладна не трэба. У тагачаснай літаратуры безліч таленавітых твораў. Як мне сказаў калісьці спадар Някляеў: «Гэтае пакаленне яшчэ ніхто не перапісаў».

**«НН»: Вось, паслухаўшы ваш канцэрт, моладзь кінецца да тамоў паэзіі ў пошуках нейкіх адкрыццяў і рокавай шчырасці, а там суцэльны «сцяг брыгады»: камсамол, хваласпевы кампартыі. Ці магчыма аддзяляць збожжа ад пустазелля ў савецкай паэзіі?**

**ЛВ:** Я, калі пачынаў праект, таксама скептычна пацягнуўся да паэтычных тамоў Танка і Куляшова. Тым больш быў эфект ад прачытаных вершаў — моцных, пранікнёных, музычных, шчырых, шэрых і апромненых, пафасных і панурых, маляўнічых і чорна-белых — такія вершы пішуцца ў любую эпоху... Хто захоча сабе нешта знайсці ў гэтых кнігах — немінуча знойдзе. Пры кожнай уладзе творцы вытрымлівалі розныя правілы гульні. Геніяльныя паэты — таксама. І цяпер вытрымліваюць.

**Гутарыў Лявон К**




**РЫГОР БАРАДУЛІН**

**Белая яблыня грому**

Белая яблыня грому
Чорных садоў ліхалецця.
Яблык яе нікому
Не пажадаю на свеце.
Голая яблыня грому
Жахам жагнала прысмерк.
Пэўна, што д'яблу самому
Помніцца горкі прысмак.
Светлая яблыня грому
З салаўінае ўсяночнай.
Ласкавага яблыка стому
Я надкусіў аднойчы.
Ціхая яблыня грому,
Першага мілага гневу.
Позірку маладому
Праглася бачыць Еву.
Добрая яблыня грому,
Радасцю поўні наўколле!
Хай жа не будзе зломлу
Голлю тваіму ніколі.
Белая яблыня грому,
Клопатам, гаманою
І на апошнюю строму
Светла ўзыдзі са мною.

1977

**Канцэрт адбудзецца 23 сакавіка**

ў Купалаўскім тэатры. Ён будзе складацца з дзвюх частак: першая — непасрэдна «Белая Яблыня Грому»: 12 песень у розных стылях. Акампануе новы склад. Лявон спадзяецца, што ніякія тэрміновыя справы не перашкодзяць Аляксандру Памідораву выканаць пакладзены на рытмічную глебу рэпу верш Францішка Багушэвіча «Немец», а Ганне Хітрык — заспяваць з ім дуэтам. У другой часты будуць розныя нечаканыя песні: сольныя, народныя, сумныя і вясёлыя.

**Да канцэрта мусіць выйсці CD**

На ім, акрамя 12 песень, тэксты, графічныя асацыяцыі Вольскага да кожнага верша, зробленыя вугалем, партрэты дванаццаці пісьменнікаў з міні-біяграфіямі.

# Унікальны беларускі фонд застанецца ў Вільні

Бібліятэку Акадэміі навук Літвы расфармоўваць, як планавалася, не будуць. Гэта дазволіць не развозіць вялікія беларускія зборы з яе фондаў па ўсёй краіне.

Загадчыца Аддзела рэдкіх кніг бібліятэкі Дайва Нарбуцене паведаміла, што «ўдалося пазбегнуць расфармавання. Наадварот, у нас пачынаецца новы этап».

У бібліятэцы сабраная ўнікальная калекцыя беларускага матэрыялу. Яе фармаванне адбывалася на аснове фондаў віленскага музея імя Івана Луцкевіча, публічнай бібліятэкі Вільні, у якой знаходзіліся кнігі з Жыровіцкага манастыра, а таксама са шматлікіх зачыненых у Беларусі каталіцкіх кляштараў.

У бібліятэцы Акадэміі навук рабілі адкрыцці вядомыя даследчыкі беларускай культуры: Адам Мальдзіс, Генадзь Кісялёў, Вячаслаў Рагойша, Генадзь Каханоўскі... Але і яны не ўсё вывучылі. Арсень Ліс кажа, напрыклад, пра рукапісы пісьменнікаў Заходняй Беларусі, якія «яшчэ трэба адкрываць».



**Бібліятэка імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы.**

Бібліятэка была заснаваная ў 1941 годзе на базе бібліятэкі Евангеліка-рэфармацкага сінода і Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі Яўстахія і Эміліі Урублеўскіх як Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літоўскай ССР. 24 лістапада 2009 года ёй надалі імя Урублеўскіх.

**Кастусь Матушыч**

# Праўдзівая гісторыя Кацапа, Хахла і Бульбаша

Кнігу з такой назвай прэзентавалі ў Мінску пісьменнікі Уладзіслаў Ахроменка і Максім Клімковіч.

Прэзентацыя ў кавярні «Валерыя» выйшла як сама кніга — вясёлая, насычаная жартамі, смехам і досціпамі — у рознай ступені апакрыфічнымі.

Аўтары патлумачылі, што ўзяцца за гістарычную прозу вырашылі пасля таго, як усвядомілі, што нашы падручнікі гісторыі хутчэй адвернуць ад вывучэння гэтай навукі, чым заахвоцяць да яе — такое ўсё ў іх зацвярдзелае ды ідэйнае. Аўтары вырашылі, што гумар і смех — якраз тое, што трэба, каб зрабіць гэтую навуку трохі цікавейшай.

Суаўтар Ахроменка расказаў прысутным, чым расійцы, украінцы і беларусы розняцца адпаведна ад кацапаў, хахлоў і бульбашоў, і падкрэсліў, што пра першых трох у кнізе няма ні слова. А суаўтар Клімковіч, гаворачы пра адметнасці розных гістарычных часоў, прапанаваў пагуляць у ролевую гульню і ўявіць сябе на месцы ягонага дзеда Міхася Клімковіча, да якога ў 1930-я прыйшоў літаратар з вялізным нажом і запатрабаваў месца галоўнага рэдактара часопіса...

Чалавецтва, як вядома, выжыла, бо смяялася.

Беларусам, каб выжыць, таксама трэба больш смяяцца.

Калі чуеш, як некаторыя дзеячы на поўным сур'ёзе заяўляюць, што «Беларусь — руская дзяржава», а «беларусы — тыя ж рускія, толькі са знакам якасці», то бывае, не ведаеш — смяяцца ці плакаць? «Вядома, смяяцца!» — лічаць Ахроменка і Клімковіч. І іх «Праўдзівая гісторыя...» — адэкватны адказ на падобныя абсурды. Тэкст многім дасць магчымасць павесяліцца — шмат знойдзецца тых, каму ўзнімуць настрой прыгоды нашчадкаў Homo Slavianikus'а — жыхароў Кацапстана, Хахляндыі ды Бульбашыі, а таксама іх ваколіцаў.

**Ахроменка У., Клімковіч М. Праўдзівая гісторыя Кацапа, Хахла і Бульбаша: апокрыф-правакацыя.** — Мінск: Галіяфы, 2009. — 142 с.

**НБ**

# У Віцебску абмяркоўваюць эскізы помніка Альгерду

У віцебскай Музычнай гасцёўні праходзіць грамадскае абмеркаванне эскізаў помніка князю Альгерду. Наведнікі могуць прагаласаваць за ўпадабаны імі варыянт.

Вялікі князь літоўскі Альгерд, пры якім дзяржава стала адной з найбольшых у Еўропе, спачатку княжыў у Віцебску і быў жанаты першым шлюбам з віцебскай князёўнай.

У конкурсе ўзялі ўдзел сем скульптараў з Віцебска і Мінска. Шэсць аўтараў прадставілі на суд публікі і прафесійнага журы конныя помнікі.

Пастамент у некаторых скульптур нагадвае замкавую вежу, адна з мадэляў упрыгожана падсветкай, ёсць таксама варыянт з пастаментам з жалезабетоннай канструкцыі, якая з трох бакоў чытаецца як літара «А».

Сярод конных скульптур вылучаецца праца пад назвай «Гонар роду Гедымінава — Альгерд і нашчадкі яго», дзе паказана скульптурная група з пяці фігур.

У цэнтры кампазіцыі, на ўзвышэнні з чорнага і чырвонага граніту, фігура князя, які трымае меч і шчыт з «Пагоняй». Побач фігуры дзвюх яго жонак — Марыі і Ульяны, а таксама сыноў ад першага і другога шлюбаў Андрэя Полацкага і Ягайлы. Пастамент помніка падобны на арку з прыступкамі, што, паводле задумы аўтара, дае гледачу магчымасць сімвалічна прайсці праз гістарычную эпоху.

Манумент Альгерду маюць паставіць у цэнтры горада на вуліцы Талстога, насупраць Свята-Уваскрасенскай царквы.

**СМ, паводле БелаПАН**

## Сцісла

### Трэці нумар альманаха «Дзеды»

Гэты дайджэст публікацый аб беларускай гісторыі прысвечаны галоўным чынам ваеннай тэматыцы — Другой сусветнай у Беларусі і рэпрэсіям, з ёй звязаным.

### Конкурс на шыльду Геніюш

Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына і суполка «Скарына» (Прага, Чэхія) абвесцілі конкурс на найлепшы эскіз памятнай шыльды ў гонар сакратаркі Рады БНР Ларысы Геніюш. Шыльду маюць змясціць у Празе, на доме, дзе жыла Геніюш, калі яе муж працаваў там доктарам. Вось тэкст на беларускай і чэшскай мовах, які мае быць размешчаны: «У поўную сілу беларускай, роўнай усім і не ўніжанай, я была толькі ў Чэхіі...»

Сёлета дзяячцы і паэтцы споўнілася б 100 гадоў. Геніюш прайшла праз савецкі канцлагер, але да канца жыцця не прыняла савецкага грамадзянства.

**АП**

## Конкурс імя Ларысы Геніюш для маладых літаратараў

Беларускі ПЭН-Цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў, прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння Ларысы Геніюш.

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 15 да 26 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны семінар і майстар-класы ў Мінск, дзе змогуць прадставіць і абмеркаваць свае творы з вядомымі пісьменнікамі, выкладчыкамі, вучонымі.

Да разгляду журы прымаюцца вершы, кароткая проза, эсэістыка, пераклады.

Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 10 красавіка 2010 г. Падвядзенне вынікаў адбудзецца 20 красавіка.

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: pen@vessobel.by (з пазнакай «Літаратурны конкурс»). Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-Цэнтр». Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.



# Афіцыйная ідэалогія ВКЛ

**У залатыя часы Вялікага Княства яна складалася з аднаго сказа: «Мы нікому навіны не ўводзім, а старыны не рушым». Піша Алег Дзярновіч.**

Аналіз дакументаў Вялікага Княства Літоўскага XV—XVI стст. дазваляе заўважыць адну важную заканамернасць — адным з галоўных прынцыпаў вялікакняскай палітыкі было правіла непарушнасці «старыны»: звычаяў і парадкаў, што склаліся на працягу дзесяцігоддзяў. Гэты прынцып «старыны» быў не толькі важным элементам афіцыйнай ідэалогіі, але і складаў неад'емную рысу масавай свядомасці тых часоў.

## Грамадскі кансерватызм

Для ўсіх станаў ВКЛ «старына» была сінонімам справядлівых парадкаў, нават ідэалам, адступленне ад якога разглядалася як недапушчальныя «крыўды» і «навіны». Але для кожнага сацыяльнага слоя гэтае паняцце было напоўненае сваім канкрэтным зместам. Людзі лічылі, што гэты «змест» — жыццёвы ўклад, вызначаны статус, аб'ёмы правоў і абавязкаў — быў уласцівы і дастаўся ад продкаў, канкрэтна, «бацькоў і дзядоў». Аргументацыя «ад старыны» была ўсім зразумелай. Гэтая мова звычаёвага права знітоўвала «нізы» і «вярхі» грамадства, нягледзячы на ўсё бясправе першых перад другімі.

Крыніцы сведчаць, што звычай арыентавацца на «старыну» ўзнік даволі позна. У полацкіх актах, якія тычацца зносінаў з Лівоніяй, спасылкі на рэаліі, якія былі «ад старажытнасці і даўніх пор», сустракаюцца з канца XIV ст.

У дакументах можна заўважыць, як з цягам часу з побытавых выразаў і формул складалася абагульненае паняцце «старыны» — прынцыпу нязменнасці традыцыйных парадкаў і ладу, ідэалу сацыяльнай справядлівасці. Важнай вяхой у гэтым працэсе стала мяжа XIV—XV стст.

## Зямельнае права

Часта прынцып «старыны» выкарыстоўваўся, каб абгрунтаваць права на зямельныя ўладанні. У судзе бакі імкнуліся давесці, што спрэчныя двор ці вёска належалі іх продкам. Даўнасць жа валодання вымяралася людскімі пакаленнямі. Але не глыбей, чым двума: бацькі і дзяды. Такі абмежаваны лік продкаў тлумачыцца панаваннем вуснай традыцыі, якая складае натуральную мяжу чалавечай памяці. Даўнейшых продкаў проста не памяталі, а пісаць не ўмелі. Бывалі нават выпадкі, калі бок, які валодаў «лістом» на зямельныя ўладанні, мог прайграць справу, бо іншы бок мог абвесціць такі «ліст» фальшывым, падробленым ці атрыманым незаконна — і ў гэтым выпадку галоўным аргументам была спасылка на саму даўнасць валодання спрэчнай зямлёй.

## Час спеласці

«Культ старыны» дасягнуў спеласці ўжо ў канцы XIV ст. Існавала разгалінаваная тэрміналогія паняцця са сваімі адценнямі — «із века», «іздаўна», «па старыне», «подлуг абычая». «Старына» ахоплівала ўсе сферы жыцця Вялікага Княства: землеўладанне, падаткі і павіннасці, мыты, нават замежную палітыку.

Свайго апагея прынцып «старыны» дасягнуў у канцы XV — першай палове XVI стст., практычна стаўшы ў перыяд Рэнесансу афіцыйнай палітыкай. Можна сцвярджаць, што ў гэты перыяд менталітэт насельніцтва ВКЛ зросся з афіцыйнай ідэалогіяй. Спасылкі на «старыну» сталі неабходным атрыбутам гаспадарскіх (вялікакняскіх) прывілеяў. Настаў перыяд класічнага панавання формулы «мы нікому навіны не ўводзім, а старыны не рушым».

## На мяжу бралі дзяцей

Вельмі паказальным прыкладам выкарыстання прынцыпу «старыны» можа быць дэмаркацыя мяжы ВКЛ з Лівоніяй.

22 студзеня 1542 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары накіраваў сваіх «пасланцаў гаспадарскіх» Івана Глебавіча Корсака і Яна Кміту Сакаловіча, каб яны «граніцы папісвалі старадаўнія, пана Радзівілава даўгосці і шыракосці, як доўга і шырока немцы забралі землі гаспадара Караля Яго міласці, землямі пана Містра Ліфлянцкага пачаўшы..., аж да граніц Маскоўскіх». Гэта было падарожжам у край, які для аўтараў XVI ст. усё яшчэ заставаўся загадкавым і часам прыгадваўся ў паўміфічным кантэксце. Дэмаркацыі 1542 г. цалкам прысвечана Кніга Метрыкі ВКЛ № 560.

У тыя часы, каб дакладна вызначыць мяжу, былі неабходныя паказанні сведкаў. Вось як гэта выглядала ў Дрысвяцкім павеце: «урадкік Дрысвяцкі пан Сямён Мацкавіч ставіў перад намі сведкаў — людзей старых, веры годных... Тыя ўсе сведкі сведчылі тым абычаем: мы памятаем, калі пан Радзівіл ездзіў і гранічыў з немцамі за Яго міласці Караля Казіміра. У той час айцове нашы ездзілі з панам Радзівілім, і нас у той час, дзяцей сваіх, з сабою бралі. І той езд памятаем, і граніцу пана Радзівілаву...»

У выпадку, калі сведкі ад старасці не маглі самі прыехаць на мяжу і паказаць, дзе яна дакладна ідзе, іх «на вазах вывозілі да нас [памежных камісараў], каторыя не маглі хадзіць...».

Цікавая дэталь — пры дэмаркацыях на мяжу наўмысна бралі дзяцей, каб яны ў будучым маглі выступаць у якасці памежных сведкаў.

Уся гэта гісторыя з «выбудоўваннем запамінання» мяжы пацвярджае тэзісы даследчыкаў сярэднявечнай культуры пра тое, што людзі той эпохі былі абыякавымі да дакладнага часу. Папросту не ўмелі яго вымяраць. Густ дакладнасці з яго павагай да лічбы і ліку быў чужым для людзей Сярэднявечча, нават высокапастаўленых. У кожнай мясцовасці час успрымаўся лакальна і антрапаморфна — гэта значыць, працякаў у адпаведнасці са зменаю пакаленняў, быў «родавым ці сямейным часам», ланцужком чалавечых генерацый.

Цікава, што пазней «старына» стала абгрунтаваннем для гаспадарчых і сацыяльна-праваых навацый у ВКЛ XVI ст.

## Кароткая памяць нашых продкаў

У той час, калі са старонак дзяржаўных актаў ВКЛ вярхоўная ўлада ў асобе вялікага князя ўсё мацней заяўляла пра вернасць традыцыям «старыны», у самім Вялікім Княстве адбываліся каласальныя трансфармацыі. У шэрагу гарадоў уводзілася Магдэбургскае права. Стваралася юрыдычна раўнапраўны і з прававога пункту гледжання адзіны шляхецкі стан, што падмацоўвалася на ідэалагічным узроўні крышталізацыяй легенды пра Палямона. Праз Статуты кадыфікавалася земскае права ВКЛ. Афармлялася Канцылярыя ВКЛ як цэнтральны орган выканаўчай улады. Ад ініцыятыў каралевы Боны першай паловы XVI ст. і праз «Валочную памеру» 1557 г. адбылася рэформа ўсяго аграрнага ладу дзяржавы.



Ян Матэйка. Партрэт гетмана Астафія Дашкевіча.

Грамадства позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу зусім не было бесканфліктным — паводле тых дакументаў, што захаваліся ў Метрыцы ВКЛ з канца XV ст., рэгулярна адбываліся судовыя цяжбы, у якія ўцягваўся вялікі князь як вярхоўны суддзя свайго гаспадарства. Судовыя кнігі і Кнігі Запісаў Метрыкі поўняцца такімі справамі, дзе за формуламі паважнага звароту да вялікага князя хаваюцца эмоцыі нявырашаных, найчасцей зямельных, спрэчак паміж суседзямі і сваякамі. Значыць, дэкларацыі прыхільнасці да «старыны» не перашкаджалі ўзнікненню гэтых канфліктаў. У такой сітуацыі апазіцыя «старыны» / «навіны» ўводзіла гэтыя канфлікты ў прававое рэчышча і паказвала шляхі вырашэння падобных спрэчак.

## Ілюзія стабільнасці

Працяглы час грамадства бачыла ў непарушнасці «старыны» ідэал сацыяльнай справядлівасці — такім чынам захоўвалася ілюзія стабільнасці, нязменнасці парадкаў, што засталіся ад продкаў. Людзі той эпохі прасоўваліся наперад са звернутым у мінулае позіркам. Здавалася, што шматлікія «навіны», многія з якіх лёгка было адмяніць спасылкай на «старыну», не былі ў стане пахіснуць асноваў. Між тым, незваротныя змены ў грамадстве Вялікага Княства ўжо пачаліся, але да пэўнага часу яны не ўсведамляліся грамадствам. Механізм непрыметнай эвалюцыі быў запушчаны.

Познесярэднявечнае грамадства валодала «кароткай памяццю» — ужо праз два пакаленні мінулае гублялася з далягляду. Выходзіць, змены лёгка маглі прышчапіцца і праз нейкі час самі станавіліся паважанай «старыной». Фактычна, застаючыся ідэалам, змест «старыны» ўвесь час абнаўляўся. Да таго ж, дзейнічаў прынцып аценачнай выбарнасці — «добрыя» новаўвядзенні, ільготы і прывілеі бесперашкодна засвойваліся грамадствам, іх навізны папросту не заўважалі.

Калі ў XV — першай палове XVI стст. «старына» карысталася найбольшым шанаваннем, дык на мяжы XVI—XVII стст. яе прыцягальнасць для жыхароў Вялікага Княства стала блякнуць. Гаспадары (каралі і вялікія князі) ужо не рэпрэзентавалі сябе як абаронцаў «старыны», але гарантавалі захоўванне правоў і прывілеяў, то бок рэаліяў, адлюстраваных у пісаным праве. Жыгімонт III Ваза ў адным з прывілеяў 1589 г. абяцаў бараніць «усе правы, прывілеі і вольнасці, як публічныя, так і асабістыя».

Культ «старыны» не мог перашкаджаць эвалюцыі грамадства — гэтая ментальная заслона мела некалькі шлюзаў, якімі былі рухомасць «старыны» ў часе і этычна-ацэначныя прынцыпы ў яе ўспрыняцці. Але кансерватыўны ідэал, які панаваў у грамадстве, прадвызначаў і своеасаблівасць сацыяльнага абнаўлення — утварыўся механізм непрыметнай эвалюцыі.

Звяртаючыся да мінулага і шануючы яго, нашыя продкі няўхільна прасоўваліся па шляху мадэрнізацыі ўласнага грамадства.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў. Запісы. Пра Якубовіча, Філарэта, Гілевіча, Мартысевіч, Тарасава...**

* * *

12 красавіка 2009 года, гэта якраз на вербніцу, Алене Аляксандраўне Магер, маці маіх стрыечных братоў Івана, Лявона і нябожчыка Яўгена, восемдзесят гадоў. Святкаваць (бо пост) вырашылі на Вялікдзень.

Як і чым павіншаваць?..

Яна ў Крэве першая верніца, пяе ў царкоўным хоры, крэўскі поп яе ўсяляк расхвальвае. Яна ўдава майго дзядзькі, найстарэйшая (хоць сама і не Магер) у крэўскай радні. І я падумаў: можа, надрукаваць на Вялікдзень паэму «Вялікдзень» з прысвячэннем і віншаваннямі, дык і някепскі будзе падарунак?

А дзе надрукаваць? У якой газеце, каб тую газету поп дазволіў у царкву занесці? У «Народнай волі»? Дык разам з «Народнай воляй» поп і верніцу з царквы папрэ.

Патэлефанаваў Паўлу Якубовічу. Сустрэліся — і ён на дзіва лёгка згадзіўся паэму надрукаваць. «Толькі...» — пачухаў патыліцу. «Канешне, — падняў я рукі, — пад псеўданімам. Але тады арганізуй блаславенне...»

Павал Ізотавіч паслаў ганца з паэмай да Філарэта — і той напісаў блаславенне. А назаўтра нехта настукаў мітрапаліту, што падпісаў ён блаславенне не Уладзіміру Магеру (для псеўданіма я ўзяў прозвішча маці), а Уладзіміру Някляеву. І як лёгка падпісаў Філарэт блаславенне, гэтак жа лёгка адазваў яго...

Бог даў — Бог забраў.

Я падумаў, што і Якубовіч сваё рашэнне адзаве. Але не, паэма на Вялікдзень у газеце «Советская Белоруссия» была надрукаваная. З прысвячэннем крэўскай царкве, з каляровым фотаздымкам Алены Аляксандраўны, з віншаваннем...

Праз гэта Чаргінец напісаў на Якубовіча... ну, так скажам, інфармацыю ў прэзідэнцкую Адміністрацыю. Што той Някляева друкуе...

Кожны піша і друкуе сваё.

* * *

З Аляксандрам Казуліным сёння (11.04.09) былі спачатку ў Барадуліна, а пасля ў Гілевіча з прапановай увайсці ў аргкамітэт па стварэнні «Беларускага дома».

Выглядаюць абодва, на жаль, не так, як у найлепшыя гады... У Барадуліна правая рука пакалочваецца, у Гілевіча да ўсяго пасляінсультнага яшчэ і цукроўніца дадалася.

Гілевіч пытаецца ў Казуліна: «Як вам мая кніга мемуараў?..» Той, засаромеўшыся, адказвае: «Выбачайце, не чытаў...» «Ну, нічога, будзе час — прачытаеце...» — кажа Гілевіч. «Калі буду мець кнігу...» — намякае на аўтограф Казулін, і Гілевіч здзіўляецца: «У вас жа яна павінна быць, я праз Алеся Пашкевіча перадаваў!» Кузулін разводзіць рукамі... «Вось жа нягоднік малы — без злосці абураецца Гілевіч, — у каторы раз падводзіць! Папрасіў яго, калі ён у Кіеў ехаў, каб Уладзіміру Яварыўскаму кнігу завёз. Пасля пытаю пры сустрэчы: «Алесь, з'ездзілі вы ў Кіеў, завезлі кнігу?..» «З'ездзіў, Ніл Сымонавіч, завёз. Яварыўскі так вам дзякаваў!..» А праз паўгода тую кнігу з маім аўтографам пляменнік ад букіністаў мне прынёс. З кнігарні на Нямізе...»

Я хоць і звык да неабавязковасці Алеся, але выказваю сумнеў, што такое магло быць. «Дык паглядзіце, — падае кнігу Гілевіч. — Бачыце, кошт алоўкам пазначаны: 25 тысяч». «Ну...— не ведаю я, што сказаць... — хоць кошт нармалёвы». І Гілевіч кажа амаль задаволена: «Кошт нішто сабе, таму і злуюся не надта...»

* * *

Тэлефануе Марыйка Мартысевіч і кажа, што яны (не ўдакладняючы, хто з ёй) збіраюцца выдаць каляндар з аголенымі беларускімі паэтамі і не маюць сумневу, што Някляеў пагодзіцца сфоткацца галяком і як аўтар «Лабуха» той каляндар адкрые, будзе ў ім месяцам студзенем...

Голас у яе вясёлы, — а што, такі прыкол, хіба не?.. хто не разумее — лох!.. — і яна перакананая, што мне таксама павінна быць весела: «Ну, што, калі вы прыйдзеце ў студыю?.. Можна, калі хочаце, сфоткацца на пару, ёсць заяўкі на вас...» — а я вось не адчуваю, што мне гэтак жа весела, як ёй, і даўно б паслаў яе, калі б не была яна слаўнае дзяўчо, якое піша файныя вершы — хоць бы пра пісьменніка Кастуся Траўня...

Вось яго б і сфоткала.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

* * *

Назаўтра па даручэнні Марыйкі [Мартысевіч — Рэд.] тэлефануе ўжо Валерыя Кустава: «Згаджайцеся, сфоткайцеся, гэта ж які прыкол!..» Кажу ёй, што згодны, калі фэйс будзе мой, а торс — Шварцэнегера. Хіба не прыкол?... Так, маўляў, Марыйцы і перакажы.

Пераказала... Зноў тэлефануе: «Марыйка прыколу вашага не зразумела. Кажа, што трэба, каб і ўнізе было ўсё вашае».

* * *

Кастусю Тарасаву цяжка пасля інсульту, ён саромеецца сябе самога, хворага. Жонка ад яго, па сутнасці, адмовілася, толькі дачка трохі даглядае, а ён піша і піша... І не абы-што, як сведчыць аповесць «На вайне».

Я спытаў яго, калі ён (амаль адразу пасля шпіталя) у нас на Карла Маркса жыў: «Косця, што ж ты цяпер рабіць будзеш?..» Ён адказаў, ледзьве вымаўляючы: «П-п-п-пі-саць...»

* * *

З арыштам жыццё найчасцей сканчаецца, але зрэдку бывае, што пачынаецца...

Юрыя Рытхэу, першага чукоцкага пісьменніка, арыштавалі ў 14 гадоў. Ні за што. Проста трэба было некаму аэрадром будаваць каля бухты Лаўрэнцiя, зэкаў не хапала — вось і арыштавалі хлапчука разам з усімі мужыкамі пасёлка Уэлен.

Калі б не арыштавалі, ён так і памёр бы ў тым Уэлене нікому невядомым чукчам. Хутчэй за ўсё, спіўся б.

Ды лёс ёсць лёс. З Чукоткі ён патрапіў у Ленінград, дзе ў 1957 годзе атрымаў тэлеграму ад Хэмінгуэя: «Так трымаць, Рытхэу!»

Так, як пажадаў яму Хэмінгуэй, трымаў Рытхэу не надта доўга. Але гэта ўжо не лёс, а ўсяго толькі ягоная асабістая праблема.

* * *

Мая бабуля любіла сядзець на валуне на ўскрайку нашага поля. Валун быў такі, што трэба было прыстаўляць лесвіцу, каб на яго ўзабрацца. Бабуля ўзбіралася і падоўгу на камені тым сядзела. Звычайна рабіла яна гэта на захадзе сонца. Глядзела, нерухомая, як яно сядае, завальваецца, палаючы, за Багушоўскі лес...

Я спытаў аднойчы: «Навошта ты на камені гэтым сядзіш і сядзіш?» Яна адказала: «А там, пад ім, мае костачкі».

Пакуль бабуля была жывая, дзіўнаваты адказ яе здаваўся мне дурнотай. Калі памерла, ён здаўся мне загадкай. Цяпер здаецца метафарай. Літаратурай.

* * *

Сто, калі не тысячу, разоў мне казалі, што я не на тым шляху, не на тым баку, бо ўсяму беларускаму, найперш мове з літаратурай, наканавана скананне.

Няхай так.

Але я ў тым не буду вінаваты.

* * *

Усё часцей стамляюся пасярэдзіне шляху.

Процілегласць смерці — не жыццё, а жаданне жыць.

* * *

Людзі — соль жыцця. Але пасыпаная па вадзе.

* * *

Вяртаючыся ў мінулае, шкадуеш пра няздзейсненае. Больш там няма чаго рабіць.

Пасля ўсім расказваеш, нібы ні пра што ў мінулым не шкадуеш.

* * *

Як толькі пацягне раскрыцца, расхрыстацца, так і згадваецца запавет Канфуцыя: «Ніколі не распавядайце пра сябе ні добрага, ні кепскага. У першым выпадку вам не павераць, у другім — прыўкрасяць».

* * *

З усяго, што было, згадваюцца найчасцей крэўскія пагоркі, па якіх іду, маленькі, і нанізваю на сцяблінку мятліцы сонейкі суніц.

## АЛЕГ МІНКІН



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ЧУЖАЯ

Ты кажаш, што з табою мы чужыя...
А гнуткая, як у лілеі, шыя?
А тонкая, як у казулі, косць?
Сум у вачах і незямная прыгажосць?

Твой свет вузенькі, як твая сукенка,
Бліскучы, жорсткі, як у воку зрэнка.
Каб быць не мной, ты, як і я, адна...
Чужыя мы, бо кроў у нас адна.




# Рыцары і сярэднявечная кухня з аркестрам Фінберга

у праграме V фэсту «Наваградскі замак — 2010».

Пасля перапынку ў Наваградак вяртаецца фестываль сярэднявечнай культуры. Пяты па ліку фэст пройдзе ў першай сталіцы ВКЛ ад 25 да 27 чэрвеня. Адметнасцю святкавання стане тое, што «Наваградскі замак — 2010» спалучаць з адзначэннем 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Юбілею прысвецяць адмысловыя тэатральныя пастаноўкі з удзелам актораў Купалаўскага і Опернага тэатраў, музычныя праграмы і круглы стол. І, натуральна, на фэсце будуць рыцарскія забавы, сярэднявечная кухня і кірмаш.

Фестываль «Наваградскі замак» збірае дзясяткі тысяч гледачоў з Беларусі і з па-за яе межаў. Першы фэст адбыўся ў чэрвені 2000 года і ладзіўся з таго часу кожныя два гады. У 2008 г. гарадскія ўлады дзеля эканоміі сродкаў святкаванне адмянілі — было вырашана перанесці яго на 2009 год, каб спалучыць з 965-годдзем горада. Але і ў 2009-м на фэст не хапіла грошай.

Замест рыцараў на святкаванне Дня горада ў Наваградак прыехаў Аляксандр Саладуха і байкеры. Грошай, зрэшты, не хапіла і на лядовы палац, які планавалі збудаваць яшчэ да 2009 г., і на аднаўленне гатэля «Еўропа» на гарадской плошчы. Не пабачаць госці фестывалю і помніка Міндоўгу аўтарства скульптара Генадзя Буралкіна.

## На помнік Міндоўгу яшчэ не назбіралі грошай.

«Да фэсту дакладна не паспеем», — паведаміў скульптар. Начальнік аддзела культуры Наваградскага райвыканкама Аляксандр Карачан патлумачыў гэта тым, што грошы на помнік збіраюцца марудна.

**Сямён Печанко**

Сродкі на помнік Міндоўгу можна пераказаць на рахунак: Аддзел культуры Навагрудскага райвыканкама, 231400, г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 9а, р/р 3632000001310 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 698, УНП 500031377, ОКПО 02234044, дзейнічае на падставе Палажэння. На выраб помніка Міндоўгу.

Таксама можна ахвяраваць на рэстаўрацыю Навагрудскага замка:

Разліковы рахунак аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама №3632000001310 у АСБ «Беларусбанк», код 698, г. Навагрудак, УНП 500031377 з адзнакай «На рэстаўрацыю Навагрудскага замка».

# «Океан Ельзи» ў шасці беларускіх гарадах



Украінскі гурт «Океан Ельзи» наведае Беларусь у маі з прэзентацыямі новага альбома «Dolce Vita».

Беларускі маршрут украінскіх музыкаў выглядае наступным чынам: Бабруйск (11 мая), Мінск (12 мая), Баранавічы (15 мая), Гродна (16 мая), Гомель (18 мая), Брэст (19 мая).

А 22 мая «ОЕ» выступяць разам з Горанам Брэгавічам у якасці хэдлайнераў на трэцім рок-фестывалі «Stare Misto» ў Львове. Васьмігадзінны канцэрт пройдзе на мясцовым стадыёне «Украіна». Горан Брэгавіч прывязе ў Львоў новую праграму «Alcohol». Кошт квіткоў пачынаецца ад 40 грывен (каля $5).

Гурт «Океан Ельзи» быў створаны напрыканцы 1994 г. у Львове. У 1998 г. музыкі пераехалі ў Кіеў. Тады ж быў запісаны дэбютны альбом «Там, де нас нема», які прынёс гурту славу і вядомасць не толькі ў сваёй краіне.

**СП**

## КАНЦЭРТЫ

### Testamentum Terrae у Віцебску

**20 сакавіка ў Віцебску** адбудзецца канцэрт старадаўняй беларускай музыкі ад гурта Testamentum Terrae. Ён пройдзе **ў бітлзклубе «Паддашак» (вул. Кастрычніцкая, 11, уваход праз абутковую майстэрню)** і пачнецца **а 20-й**.

### Камоцкі ў Купалаўскім

**19 сакавіка а 19-й на Малой сцэне Купалаўскага тэатра** Алесь Камоцкі прадстаўляе канцэртную праграму «Мітусня каляровых дзён». Спосаб набыцця квіткоў толькі адзін: патэлефанаваць (029) 253-25-04 і набыць. І ніяк інакш.

### Jazz Chopin

**24 сакавіка ў Вялікай канцэртнай зале Філармоніі (пр. Незалежнасці, 50) а 19-й** пачнецца канцэрт JAZZ CHOPIN у рамках святкавання года Фрыдэрыка Шапэна. Выканаўцы: камерны аркестр AUKSO.

## ІМПРЭЗЫ

### Дзень святога Патрыка

**20 сакавіка ў Палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)** — гарадскі фестываль ірландскай культуры «Дзень святога Патрыка». У праграме майстар-клас па ірландскіх танцах (13.00—15.00), канцэрт танцавальных калектываў (16.00), кейлівечарына (18.00).

### Вечарына «Кнігазбору»

**17 сакавіка ў Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3)** — святочная вечарына «Збіраўся скарб: 50 тамоў «Беларускага кнігазбору». **Пачатак а 18-й.** На вечарыне выступяць пісьменнікі, заспяваюць Лявон Вольскі, Таццяна Беланогая. Рэй вядзе паэт Міхась Скобла. Уваход вольны.

### Дзве акцыі з удзелам Хадановіча

**18 сакавіка ў «КнігарніЎгалерэі» (пр. Незалежнасці, 37а)** адбудуцца дзве літаратурныя акцыі. **Ад 19.00 да 20.00**, у межах чытанняў з часопісам «ПрайдзіСвет», — вечарына французскай паэзіі. Прагучаць арыгіналы вершаў Ж. дэ Нэрваля, Ш. Бадлера і А. Рэмбо, а таксама іх беларускія пераклады. **Ад 20.00 да 21.00** аўтограф-сесія: Андрэй Хадановіч падпісвае сваю новую кнігу «Несіметрычныя сны».

### Беларускія танцы

**Штосераду ад 19-й да 23-й у кавярні «Жар-птушка»** адбываюцца беларускія вечарынкі. Уваход каштуе 6 тыс. рублёў з носа. Зазвычай збіраецца каля 70—80 чалавек. Наведваюць танцы пераважна юнакі і дзяўчаты: студэнты і працоўныя. Але прыходзяць часамі, у ранейшыя гадзіны, і сем'і з дзецьмі-школьнікамі, якія паміж танцамі тусуюцца ля гульнявых аўтаматаў. Для дзяцей уваход нічога не каштуе. На танцах вучаць ойру, падэспан, полькі. Большасць наведнікаў — беларускамоўныя. Кавярня месціцца ў парку Горкага, ля вадаспаду. Даезд да метро «Плошча Перамогі» ці аўтобусам нумар 100 па праспекце. Або трамваямі да прыпынку «Парк Горкага».

## ВЫСТАВЫ

### Гістарычны музей: экспануецца ўпершыню

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 29 мая** працуе выстава «Экспануецца ўпершыню», якая знаёміць наведнікаў з новымі набыткамі музея.

### Зваротны бок зорак

Запрашаем на выставу «Зваротны бок зорак» фотамастака Аляксандра Ждановіча (Tarantino), якая экспануецца **да 25 сакавіка ў кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20)**. На выставе прадстаўленыя фотаздымкі гуртоў «Ляпіс Трубяцкі», «Нейра Дзюбель», «Без білета», «The Toobes», «Дзецідзяцей», «Срэбнае вяселле», «Разбітае Сэрца Пацана», «Крамбамбуля» і многія іншыя.

### Віктар Альшэўскі

**Да 22 сакавіка ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** працуе выстава жывапісу Віктара Альшэўскага «Фрагменты Вавілонскай вежы». Гэта працяг выставачнага праекта «Легенды нашай цывілізацыі».

### «Стан» Наталлі Яўмененкі

**У галерэі «Свет фота» (вул. Прытыцкага, 10а)** працуе фотавыстава Наталлі Яўмененкі «Стан». Перад вамі — своеасаблівы расповед пра ўзаемасувязь месца мадэлі і фатографа.

### Жывапіс Валяр'яны Жоўтак

**У Мастацкім музеі да 29 сакавіка** працуе выстава жывапісу Валяр'яны Жоўтак «Кола часу». Мастачка працавала ў розных жанрах, але найбольш вядомыя яе нацюрморты.

### Цёплае дрэва — халодны метал

**У Гістарычным музеі да 21 сакавіка** працуе выстава разьбяра і чаканшчыка Юрыя Адамовіча «Цёплае дрэва — халодны метал». Работы выкананыя ў мяшанай тэхніцы, што яднае ў сабе разьбу па дрэве і халодную, ручную, прарэзаную, аб'ёмную чаканку.

### Тэатр юнага гледача і яго гісторыя

Чым жыў тэатр дзесяцігоддзі таму? Якімі афішамі заклікаў да сябе дзетак, а таксама іх бацькоў? Пра ўсё гэта можна даведацца на выставе, прысвечанай 55-годдзю творчай дзейнасці Тэатра юнага гледача, якая працуе да **31 сакавіка ў «Гасцёўні Уладзіслава Галубка» (вул.Старавіленская, 14)**.

### Кветкавы баль

**У Музеі Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а) да 28 сакавіка** працуе выстава фларыста Дзіны Шымук «Кветкавы баль». Дзіна Шымук — першы беларускі фларыст, яна працуе ў тэхніцы ашыбана. Гэта жывапіс раслінамі. Мастак збірае і засушвае кветкі, зёлкі, лісце, а пасля стварае з іх творы.

### Выстава Аляксея Кокцева

**У мастацкай галерэі «Палац мастацтва» да 19 сакавіка** працуе персанальная выстава Аляксея Кокцева, прымеркаваная да 65-годдзя мастака.

### Стан розуму

**Да 30 сакавіка ў галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а)** працуе выстава інсталяцый State of Mind (Стан розуму) Анікі Карлсан Рыксан і Анны Віёлы Хальберг (Швецыя).

## ТЭАТРЫ

### 18 сакавіка

**Тэатр лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

### 19 сакавіка

**Тэатр лялек** — «Гісторыя аднаго горада»
**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»

### 20 сакавіка

**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў Княства Сноў»
**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў Княства Сноў»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

### 21 сакавіка

**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»

### 22 сакавіка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Загадкавыя варыяцыі»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»
**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»

### 23 сакавіка

**Тэатр лялек** — «Пінокіа»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачыха)»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»

### 24 сакавіка

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»
**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»
**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»

### 25 сакавіка

**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Тэатр лялек** — «Чайка. Досвед прачытання»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

### 26 сакавіка

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

## КІНО

### Драма прафесійных палюбоўнікаў

**Шэры** (Cheri)
Вялікабрытанія — Нямеччына, 2009, каляровы, 92 хв.
**Рэжысёр:** Стывен Фрырз
**Ролі выконваюць:** Мішэль Пфайфер, Руперт Фрэнд, Кэці Бэйтс
**Жанр:** Вінтажная меладрама паводле рамана Калет
**Адзнака:** 6 (з 10)




Пачатак XX стагоддзя. Эпоха слынных жанчынаў, якія круцілі мужчынамі.

Былая курцізанка просіць каляжанку трохі павучыць жыццю сына. Адукацыя перарастае ў закаханасць, але маці-інтрыганка збіраецца ажаніць сына на маладзенькай. Палюбоўнікі Шэры і Леа развітваюцца, але не могуць жыць адно без аднаго.

У цэнтры малімоннай карціны — інтрыгі мужчыны-нарцыса (Руперт Фрэнд) і пакуты старэючай жанчыны (незабыўная Мішэль Пфайфер). Героі падманваюць адно аднаго, гуляюць у рэўнасць, уцякаюць — і баяцца прызнацца ў каханні.

Карціна каштоўная рэжысёрскай дасведчанасцю, філіграннай акторскай гульнёй і тонкім сумам. І гэта не дзіўна: нябачныя персанажы пекнае стужкі — старасць і смерць.

**Андрэй Расінскі**

# Фільм з інтэрнэта скачаецца на мабільнік за дзесяць хвілін

**У Беларусі з'явілася новая звышхуткая тэхналогія перадачы дадзеных — HSPA+.**

11 сакавіка мабільны аператар life:) запусціў новую тэхналогію перадачы дадзеных — HSPA+. Гэта апошняя прыступка развіцця сувязі перад прыходам так званага чацвёртага пакалення стандартаў. Хуткасць інтэрнэту дасягае 16 Мбіт/сек. Каб скачаць фільм памерам 1,4 гігабайта, дастаткова 10 хвілін.

Пакуль што навінкай могуць карыстацца толькі жыхары Мінска і Гомеля. У кожным з гэтых гарадоў усталявана па 50 базавых станцый HSPA+. У бліжэйшы час паслуга з'явіцца і ў іншых абласных цэнтрах.

Стандарт HSPA+ іншымі словамі называецца 3,75G — гэта яшчэ не чацвёртае пакаленнне, але ўжо і не трэцяе. Хуткасць перадачы звестак усё павялічваецца, але і патрабаванні да тэхнікі больш жорсткія.

### Хто скарыстаецца новай тэхналогіяй?

Прадстаўнікі life:) пераконваюць, што папярэднім ноу-хау кампаніі, 3G — памятаеце бясконцыя рэкламныя ролікі з рэперам Сярогам? — карыстаецца кожны шосты абанент кампаніі. Гэта ажно 200 тысяч чалавек. Як быццам бы 50 тысяч з іх змогуць бесправаблемна перайсці на HSPA+. Сапраўды, частка мадэмаў, якія падтрымлівалі ранейшыя фарматы сувязі, запрацуюць і на новай хуткасці. Дарэчы, у інтэрнэт-крамах самы недарагі мадэм каштуе $100.

Іншыя аператары мабільнай сувязі — МТС і «Вэлком» — таксама абяцаюць сваім абанентам новы фармат сувязі, праўда, дагнаць life:) яны пакуль што не могуць. 15 сакавіка «Вэлком» запусціў-такі 3G-сувязь. МТС застаецца аўтсайдэрам.

### Туркі зноў наперадзе

Тым часам life:) нацэліўся на чацвёртае пакаленне сувязі — LTE. У тэорыі хуткасць перадачы інфармацыі можа дасягнуць 40 мегабайтаў у секунду. Турэцкая кампанія пакуль што гатовая ўкладваць проста шалёныя інвестыцыі ў беларускую інфраструктуру, нягледзячы на стратныя гадавыя справаздачы.

**Ягор Марціновіч**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Гендырэктар life:) Азджан Эрміш забяспечвае гіганцкія інвестыцыі ў сваю сетку.**

**Этапы развіцця стандартаў мабільнай сувязі ў Беларусі**

| | |
|---|---|
| 2G | GSM + GPRS |
| 2.75G | EDGE — тут спыніўся МТС |
| 3G | UMTS (W-CDMA) — тут спыніўся Velcome |
| 3.5G | HSDPA |
| 3.75G | HSPA+ — тут спыніўся Life:) |
| 4G | WiMAX / LTE |

## Сапраўдная беларуская кухня

### Суп шэры выдатны

1,25—1,5 кг ялавічыны, 2 цыбулі, 3 морквы, 1 пятрушка, 1 парэй, 0,5 сельдэрэю, 200 г масла, 0,5 шклянкі пшанічнай мукі, 1 галоўка капусты, прыгаршчы бульбы.

Ялавічыну прыгатаваць звычайным спосабам; парэзаць на кубікі парэй, сельдэрэй, пятрушку, моркву, бульбу і цыбулю, усыпаць у каструлю, дадаць 100 г свежага масла, трошкі насычанага тлустага булёну, няхай смажыцца да мяккасці. Пасля таго як гародніна падсмажыцца, дадаць пшанічную муку, зноў падсмажыць усё на агні, развесці булёнам, давесці да кіпення, памешваючы. Калі закіпіць — працадзіць праз густое сіта. Гарнірам для гэтага супу можа быць белакачанная капуста, звараная качаном да мяккасці і разрэзаная на чатыры часткі, прысоленая па смаку. Смак супу залежыць ад мяса і ад гароднін, якая дадаецца. Падчас прыгатавання трэба звяртаць увагу, каб суп не быў ні занадта густы, ні занадта рэдкі.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

ЗДАРОЎЕ

# Часнок спыняе развіццё раку ў арганізме

У выніку нітразавання (унутраны працэс, звязаны з утварэннем азоцістых злучэнняў) некаторыя нітраты з ежы ператвараюцца ў канцэрагены. Каля 20% спажываных нітратаў робяцца нітрытамі (солямі азоцістай кіслаты $HNO_2$), якія, у сваю чаргу, пераходзяць у нітразаміны — злучэнні, многія з якіх здольныя выклікаць рак.

Нітраты, што змяшчаюцца ў гародніне, кампенсуюцца вітамінам С, які не дае ім перайсці ў небяспечную для чалавека форму. Часнок, таксама як і гэтыя вітаміны, з'яўляецца антыаксідантам, такім чынам, ён можа нейтралізаваць небяспечныя азоцістыя злучэнні.

Навукоўцы прааналізавалі звесткі эксперымента, праведзенага ва Універсітэце штата Пенсільванія (ЗША). На працягу тыдня з рацыёну ўдзельнікаў цалкам выключаліся нітраты і часнок. Пасля ўсе ўдзельнікі прынялі нітрат натрыю ў бяспечнай дозе, якая маркіруе ў аналізе мачы магчымае развіццё таксічных працэсаў. Затым групам удзельнікаў былі прапанаваныя капсулы, якія ўтрымліваюць як свежы часнок, так і яго высушаны экстракт, у дозах 1, 3 або 5 г. Асобная група ўдзельнікаў атрымала 500 мг аскарбінавай кіслаты (вітаміну С).

Аналізы паказалі зваротную залежнасць развіцця працэсаў нітразавання ад ужывання часнаку — у тых, хто з'ядаў па 5 г часнаку, была найменшая рызыка захварэць на рак. Гэта адбываецца дзякуючы ўтрыманню ў часнаку серы. Звычайны зубок можа важыць ад 1 да 5 г.

**КаМ**

ВЫХАВАННЕ

# Каб добра вучыцца, дзеці павінны больш спаць

Каб дзіця не толькі расло (падчас сну вызваляецца гармон росту), але і добра запаміналa новую інфармацыю, яно мусіць больш спаць. Бо менавіта ў сне адбываецца перапрацоўка, абагульненне і запамінанне інфармацыі. Навукоўцы з Арызонскага ўніверсітэта (ЗША) яшчэ раз даказалі гэта доследным шляхам.

Даследаванне праводзілася з 48 дзецьмі ва ўзросце 15 месяцаў.

**Хуткі сон**

гэта пятая стадыя сну, якая нагадвае стан няспання, хоць чалавек і знаходзіцца ў поўнай нерухомасці. Калі ў гэты час абудзіць спячага, то ў 90% выпадкаў можна пачуць аповед пра яркі сон. Хуткі сон перапыніць цяжэй, чым марудны. Мяркуюць, што хуткі сон забяспечвае функцыі псіхалагічнай абароны, перапрацоўку інфармацыі, яе абмен паміж свядомасцю і падсвядомасцю.

Малым неаднаразова прайгравалі запісы невялікіх простых фраз на роднай мове, каб дзеткі навучыліся іх пазнаваць. Пасля гэтага праводзіліся спецыяльныя псіхалагічныя тэсты. Яны паказалі, што дзеці, якія пасля праслухоўвання запісаў спалі ад 4 да 8 гадзін, лепш запаміналі пачутую інфармацыю. Малыя, якім спаць пасля «лекцый» не давалі, гэтым пахваліцца не маглі.

«Мы ведаем, што ў маленькіх дзяцей пераважае фаза «хуткага» сну; так развіваецца іх мозг у перыяд росту. Каб дзеці змаглі засвоіць і абагульніць інфармацыю, пасля яе атрымання ім неабходны дастатковы сон. Калі дзіця не зможа паспаць 4—8 гадзін пасля «ўрока», то, магчыма, яно страціць усю інфармацыю», — кажа кіраўнік даследавання, прафесар кафедры псіхалогіі Лін Нэйдэл.

**КаМ**

## Прыватныя абвесткі

**КАНТАКТЫ**

**Шукаю сяброўку** для шлюбавання. Астатняе — праз СМС-ліставанне альбо размову па тэлефоне. Т.: (033) 683-95-84. Улад.

**Шукаем беларуса** без ш/з на падсяленне ў прахадны пакой, вул. Лермантава. Т.: (029) 646-95-69.

Здымем дом (паўдома) у Мінску ці ў ваколіцах. Т.: (029) 774-91-64.

**ПАДАРОЖЖЫ**

**Антон Астаповіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 28 сакавіка па маршруце: Шчучын—Каменка—Дэмбрава—Галавічполле—Ішчолна—Лядск. Т.: (029) 111-73-32, (017) 262-73-43.

**КНІГІ**

**Тэрмінова** набуду часопіс «ARCHE» (№ 2, 2000 год). Тэл. (029) 359-23-90 ці faberrashed@gmail.com.

**ПРАЦА**

**Якасныя** беларуска-расійскія/расійска-беларускія пераклады. Дзве тысячы за старонку. Т.: (029) 774-91-64.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

АЎТА

# Daihatsu адклікае чвэрць мільёна аўтамабіляў

Daihatsu — даччыная кампанія Toyota — адклікае больш за чвэрць мільёна машын праз дэфекты, сярод якіх — адсутнасць некаторых дэталяў у пярэдніх колах.

Гэтая мера тычыцца выключна японскага рынку.

За апошнія некалькі тыдняў свае аўтамабілі былі адклікалі такія гіганты, як Toyota, Honda, Nissan і General Motors.

**СМ**





# Газетка дзеткам

1. Злучае гарады.
2. Месца, дзе ўтвараецца торф.
3. Свойская жывёла.
4. Гаваркая птушка з доўгім хвастом.
5. Птушка, якая каркае.
6. Адрэзаная частка дрэва.
7. Без яе не заробіш.
8. Частка дома, дзе трымаюць прыпасы.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |
| | А | | О | | А |



СВЯТА

У адной руцэ — сцяжок,
У другой руцэ — ражок.
Ду-ду-ду, ду-ду-ду! —
Гэта я на свята йду.

**Сяргей Сокалаў-Воюш**



# Мінск, вясна

PHOTO.BYMEDIA.NET



Тыдзень моды ў Берліне. Калекцыя мадэльнага агенцтва Agent Provocateur.




Цырк. У Баранавічах у Лядовым палацы выступаў Вялікі Маскоўскі цырк. Былі ў праграме і мядзведзі. Адзін з іх ездзіў па арэне на веласіпедзе з вялікім чырвона-зялёным сцягам.

## АНЕКДОТЫ

* * *

Прыгажосць патрабуе ахвяр.

Прыгажосць уратуе свет.

Высновa: уратаванне свету патрабуе ахвяр...

* * *

Страшна раўнівая жонка мужу:

— Зараз жа пакажы гэты ліст. Па почырку на канверце відаць, што яно ад жанчыны. Дый, зноў жа, чаго гэта ты так збялеў, чытаючы?

— Вазьмі, каханая, гэта рахунак з твайго салона прыгажосці...

* * *

— Бацюшка, а можна піць гарэлку падчас посту?

— Укушай, але без радасці!

* * *

— Ведаеш, праз пару гадоў я выйду на пенсію і нарэшце змагу скончыць кнігу, якую пачаў трыццаць гадоў таму.

— А што ты чытаеш?

* * *

— Узяў крэдыт, хачу зрабіць пластычную аперацыю.

— А навошта табе пластычная аперацыя?

— Каб крэдыт не аддаваць!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Магілёў.** У студні адкрылася ў нас конна-жалезная дарога і ўжо патрапіла зарэзаць адну кабеціну.

У скорасці маняцца завесці ў нас электрычнае святло. Драты ўжо панацягвалі.

**«НН». №11. 1910**

На Усходзе незадавальненне выказваюць на кухнях, на Захадзе — на вуліцах.

*Хапун* (слова 90-х) на плошчы Свабоды, прабіты *дубіналам* (або *інтэгратарам* — таксама слова 90-х), абраз Маці Божай Чарнобыльскай работы Алеся Марачкіна, 200 прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, інтэрнаваных на Акрэсціна ў красавіку 1996 года, каб Чарнобыльскі Шлях не перайшоў у рэвалюцыю 1 траўня, «Дарагія мае масквічы» Касі Камоцкай, «Мы партызаны, лясныя браты» Лявона Вольскага, касманаўты ў блакітных камбінезонах. Жывая гісторыя.

Мы стваралі самыя харошыя дні Мінска XX стагоддзя. Дэманстрацыі другой паловы 90-х былі найперш выключнымі праявамі прыгажосці.

Нічым гісторыя так не даражыць, як хараством. І хараство стваралі мы.

Чакаючы чарговага Маршу, разумееш важнасць аднога-адзенькага дня. Як шмат можа вырашыць проста дождж або проста сонца. Проста намаганне аднаго чалавека.

**«НН». №11. 2000**



Багатыя таксама шушукаюцца. Хілары Клінтан і Мішэль Абама падчас цырымоніі ў Дзярждэпартаменце ЗША.



REUTERS

Зімбабвійскія браканьеры разбіраюць забітага слана. У краіне цяпер галадае каля двух мільёнаў людзей.




Улады румынскага гарадка Пекіка ўсталявалі дарожныя знакі «Асцярожна, п’яны пешаход!» ля бараў і рэстаранаў.




SVABODA.ORG




У Англіі пачалі рабіць цыгарэты, якія нагляднa дэманструюць, што бывае ад курэння.

Адказы да старонкі 15: Дарога, балота, карова, сарока, варона, калода, работа, камора.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 16.03.2010.
Замова № 1288.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614